Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 289 (5122)
СНЕЖНЯ
26
СЕРАДА
1934 г.
год выдання XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ПАЎТАРЭННЕ ПАДЗЕЙ 30 ЧЭРВЕНЯ У ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ, 25 снежня. (БЕЛТА). Увага ўсяго французскага друку прыцягнута да падзей у Германіі.

Паведамленне агенцтва Гавас з Берліна гаворыць аб шматлікіх аблавах і тысячах арыштаў, праведзеных за апошнія тры тыдні. Карэспандэнт «Пці журналь» называе лічбу арыштаў па адных вестках 1.500, а па другіх — 4.000. Французскі друк піша, што, не гледзячы на запэўненні Герынга і іншых, у Германіі адбываецца другое 30-е чэрвеня.

Пертынакс піша ў «Эко дэ Пары» аб 250 пакараных смерцю у тым ліку Брукнеру—нацыянал-соцыялістскім актывісце. Генцу, Аўнштэйне, капітана Пфеферу і інш. Пертынакс паведамляе таксама аб раззбраенні трохтысячнага атрада ахоўных войск.

Прычыны ўсіх гэтых сурова... ацэньваюцца тут аднадушна: гэта ...нісільная барацьба супроць ... элементаў сярод нацыянал-соцыя... ліскай партыі, якія паверылі ... тое, што слова «соцыялізм» ... ходзіць у назву партыі не толь... для ашукання мас.

ПРАЦОУНЫЯ БССР І УСЁИ КРАІНЫ СОВЕТАУ ПАТРАБУЮЦЬ СУРОВАЙ КАРЫ ЗАБОЙЦАМ тав. КІРАВА І ІХ НАТХНІЦЕЛЯМ!

УСЕ СІЛЫ НА ЗАВЯРШЭННЕ ГАДАВОЙ ПРАГРАМЫ ЗАГАТОУКІ І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

Загатоўкі і вывазка лесу па БССР ідуць настолькі незадавальняюча, што гэта выклікае сур'ёзную трывогу за выкананне плана IV квартала. Асабліва дрэнна ідзе ВЫВАЗКА. На 10 снежня дзелавой драўніны загатоўлена 53,5 проц. квартальнага плана, а вывезена і таго менш—23,3 проц. Дроў загатоўлена 79,6 проц., а вывезена 37,2 проц. З такім ганебным балансам леспрамгасы БССР завяршаюць гаспадарчы год, у той час як уся прамысловасць рэспублікі наўхільна ідзе на ўздым, калі кожны дзень тэлеграф прыносіць радасныя весткі з раду заводаў і фабрык аб сканчэнні гадавой вытворчай праграмы.

Чаму так дрэнна працуе важнейшы ўчастак лясной прамысловасці?

ПЕРШАЯ ПРЫЧЫНА — САМА-СУПАКАЕННЕ, АБЫВАТАЛЬСКАЕ БЛАГАДУШША, ЯКІМ ПРАСЯКНУТ АПАРАТ, ПАЧЫНАЮЧЫ АД ТРЭСТА ЛЕСБЕЛА І КАНЧАЮЧЫ ЛЯСНОЙ ДЗЯЛЯННКАЙ. Практыка іх работы з усёй пераканаўчасцю пацвярджае правільнасць перасцярог праводыра партыі таварыша Сталіна аб небяспецы гапавакружэння ад поспехаў. Завяршыўшы трэці квартал, кіраўніцтва трэста Лесбела (Шапіра) і кіраўніцтвы леспрамгасаў пачыналі на паўрах, но мабілізавалі апарат на выкананне плана чацвертага, самага адказнага, самага рашаючага квартала, які вызначае работу ўсяго гаспадарчага года і поспех першага квартала новага, 1935 года.

Рад леспрамгасаў з месяца ў месяц зрываюць загатоўкі і вывазку лесу. Да такіх леспрамгасаў адносяцца: Ельскі (дырэктар Фінкельштэйн), Глускі (дырэктар Мухаёў), Лепельскі (дырэктар Пікетьнік) і іншыя. Загатоўка і вывазка драўніны тут хістаецца ад 11 да 20 проц. квартальнага плана. Становіцца зусім незразумелым, чаму трэст Лесбел да гэтага часу церпіць у кіраўніцтве людзей, якія не забяспечваюць выкананне даверанага ім задання?

Як адносіцца кіраўніцтва трэста да такіх людзей? Для характарыстыкі прыведзем толькі адзін прыклад. Дырэктар Лепельчыцкага леспрамгаса Мухаёў не зрыў'е арганізаваць выкананне плана загатовак і вывазкі. Трэст у «пакаранне» перакідвае яго ў Глускі леспрамгас, але і там ён, таксама як і ў Лепельчыцах, правальвае работу: выкананне плана ідзе на ўзроўні да 20 проц.

ДРУГОЙ РАШАЮЧАЙ ПРЫЧЫНАЙ ЗРЫВУ ЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА СЛАБАЕ ПРЫЦЯГНЕННЕ РАБОЧАЙ І ГУЖАВОЙ СІЛЫ. Кіраўнікі трэста і леспрамгаса недаацэнілі палітычнага значэння работы па ахвату дагаворамі рабочай сілы і гужавога транспарта. Як была праведзена гэта работа? Трэст Лесбел замест непасрэднага кіраўніцтва вяртоўкай даручыў гэту справу тэхнічным работнікам апарата. У выніку рад леспрамгасаў (Аршанскі, Бярэзінскі, Чачэрскі) заключылі дагаворы толькі на 50 проц. патрэбнай колькасці рабочых і гужавога транспарту. У большасці леспрамгасаў заключэнне дагавораў насіла чыста фармальны характар. Важнейшую работу, рашаючую лёс загатовак і вывазкі лесу, работнікі леспрамгасаў абыгнулі. Вось адзін са шматлікіх фактаў. На шклоўскім лесаўчастку дагаворы заключаліся культагляд чыкам са старшынямі праўленняў калгасаў, без прыцягнення шырокіх мас калгаснікаў і аднаасобнікаў. Зусім зразумела, што такі дагавор не аўтарытэтны, па сутнасці шкодны. У выніку такога заключэння дагавораў рабочы, прыходзячы на дзялянку, не ведае ні сазёй нормы, ні ўмоў аплаты. А вядома, што зарплата — важнейшы вагар уздыму прадукцыйнасці працы і якасці работы.

Ва многіх раёнах (Рэчыца, Барысаў) вярбоўку рабочай сілы праводзілі толькі ў калгасах. Палітычная шкоднасць гэтага зусім відавочна, бо аднаасобнік ставіцца ў прыведзеным вышэй становішчы ў адносінах да калгаснікаў. Гэта памылка не была своечасова выпраўлена райкомамі партыі і райвыканкомамі.

Найпершая задача кіраўніцтва трэста Лесбел, леспрамгасаў і раённых арганізацый — забяспечыць па трэбнай колькасцю рабочых і гужавой сілы для рубкі і асабліва для вывазкі дзелавой драўніны і дроў з лесу.

ТРЭЦЯЯ ПРЫЧЫНАЙ ЗРЫВУ ПЛАНА З'ЯЎЛЯЮЦЦА ЗУСІМ ДРЭННЫЯ, НЕГАСПАДАРЧЫЯ АДНОСІНЫ ДА МЕХАНІЗАЦЫІ І ЎЛАСНАГА ТРАНСПАРТУ. Напрыклад, у Бягомльскім і іншых леспрамгасах рацыяналізацыйныя шляхі транспарта (ляжнёўні) сакрыстоўваюцца дапёка непоўнасцю. Або возьмем работу аўтатранспарта. У Рэчыцы, Бабруйску, і іншых леспрамгасах, машыны больш стаяць у рамонце, чым працуюць. А значная частка хадавога часу трацціцца на другарадныя перавозкі, а не на вывазку лесу — асноўную задачу аўтатранспарту.

Зусім недапушчальным з'яўляецца вялікая запазычанасць па заработнай плаце, якая складае больш двух мільёнаў рублёў. Не гледзячы на неадназначовыя ўказанні СНК БССР і на папярджэнне ўпаўнаважанага Камісіі совецкага кантроля па БССР, запазычанасць да гэтага часу не ліквідавана.

Своечасова выдаваць зарплату, палепшыць культурна-бытавое абслугоўванне ў лесе — задача дня. Трэба асабліва падкрэсліць недапушчальнасць такіх настрояў, як у Лепельскім, Сіроцінскім і іншых раёнах, што «загатоўкі і вывазкі лесу — другарадная справа». Партыя і ўрад патрабуюць ад кіраўнікоў раёнаў — сакратароў райкомаў партыі і старшынь райвыканкомаў — безумоўнага выканання заданняў па лесу.

Найвялікшая адказнасць кладзецца на дырэктароў леспрамгасаў і кіраўніцтва трэста Лесбел у сувязі з адменай водпуску фуражу па нармаваных цэнах. ТРЭСТ НЕ КІРУЕ ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ГАНДЛЮ ФУРАЖОМ. Між тым, у Полацкім, Лепельскім і іншых леспрамгасах ён зусім не завезен. Па 19-ці леспрамгасах не хапае 3800 тон сена. Забяспечыць шырокі гандаль фуражом, неб кожны калгаснік і аднаасобнік, працуючы на вывазцы лесу, мог яго набыць за наяўны разліч у патрэбнай колькасці — неадкладная задача.

Важнейшыя будоўні Саюза чакаюць будаўнічага матэрыялу. Пролетарскія цэнтры адчуваюць патрэбу ў палае. Справа гонару работнікаў лесу па-большэвіцку ўзяцца за работу і забяспечыць паспяховае завяршэнне плана IV квартала і базаваю падрыхтоўку да новага гаспадарчага года.

ТАВАРЫШУ РАФАЛЬСКАМУ—МАСТАЦКАМУ КІРАЎНІКУ ДЗЯРЖАЎНАГА ЯЎРЭЙСКАГА ТЭАТРА БЕЛАРУСІ

Совет Народных Камісараў БССР горача вітае Вас з 25-годдзем Вашай сцэнічнай дзейнасці на фронце пролетарскага мастацтва. З 25 год дзве трэці гэтага часу Вы працавалі ва ўмовах разнявоенай культуры ад капіталістычных і буржуазных найданаў у свабоднай дзяржаве пролетарскай дыктатуры, ва ўмовах магутнага і пераможнага руху і барацьбы працоўных мас СССР за сваю родную пролетарскую культуру. Не мала за гэтыя вялікія гады прышлося нам змагацца з атрэп'ем эксплаататарскіх класаў, якія і ва ўмовах совецкага ладу імкнуліся насаджаць сярод мас сваю кулацка-капіталістычную культуру і мастацтва і тармазіць росквіт новай соцыялістычнай культуры. Не мала ў свой час і напсавалі нам гэтыя падонкі пераможанага ў нас капіталізма. Яны прабавалі ў сваёй варожай дзейнасці абаперціся на шавіністычныя перажыткі адсталых мас, на клерыкальна-капіталістычныя элементы і на тых прадстаўнікоў старой інтэлігенцыі, якія схоўвалі абмежавана-нацыяналістычную кулацкую ідэалогію. У гэты час, час жорсткай барацьбы пролетарыята за сваё пролетарскае мастацтва, супроць кулацка-буржуазнай ідэалогіі ў мастацтве—Вы, адзін з лепшых майстроў сцэны, цалкам аддалі свае веды і сваё майстэрства рабочаму класу і ўсяму працоўнаму народу і сталі ў рады перадавых барацьбітоў за новую, нашу родную і вялікую культуру, культуру пераможнага пролетарыята, на помсты старога, нацыяналістычнага, на будоўлі новага, соцыялістычнага Вы і падняліся, як выдатны майстар совецкага мастацтва і цалкам звязалі сябе са справай пролетарыята, са справай вялікай нашай партыі і з самой партыяй, стаўшы яе членам.

Іменна за гэта, за прыкладную работу на фронце пролетарскага мастацтва, рабочы клас, наша партыя і совецкі ўрад акружылі Вас сваёй увагай і клопатамі. К Вашаму юбілею ўрадам Беларусі вынесена пастанова аб узнагародзе Вас высокім званнем народнага артыста рэспублікі. Гэта вялікі гонар для дзеяча мастацтва, але гэта высокае званне адзначасова накладвае на Вас і новыя, вельмі адказныя і ганаровыя абавязкі — узнімаць пролетарскае наша мастацтва яшчэ вышэй як ідэйна, так і мастацкі, да канца і без астатку вытрушваць рэшткі нацыяналістычных перажыткаў, высока і цвёрда трымаць сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма. Гэта ўскладае на Вас задачу яшчэ больш энергічнай барацьбы за партыйнасць у мастацтве, за культуру нацыянальную па форме і соцыялістычную па зместу. Вучэнне вялікіх настаўнікаў марксізма — Леніна-Сталіна — вось пуцяводная зорка і сцяг, які павінны Вы высока і цвёрда трымаць, працуючы над удасканаленнем тэатральнага мастацтва, робячы яго сапраўды народным мастацтвам, мастацтвам Леніна-Сталіна.

Жадаю Вам, тав. Рафальскі, поўнага поспеху і яшчэ многа, многа год паспяхова і пладатворна працаваць на ідэалагічным участку вялікай соцыялістычнай будоўлі. Горачае прывітанне юбіляру!

З ТАВ. ПРЫВІТАННЕМ:
СТАРШЫНЯ СОУНАРКОМА БССР
М. ГАЛАДЗЕД.

Каб ніякая гадзіна не пашкодзіла нашай радзіме

З рэзалюцыі дывізійнага сходу партыйнага актыву 23 снежня 1934 г.

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад т. Карбоўскага аб контрраволюцыйным тэрарыстычным «ленінградскім цэнтры» падонкаў зіноўеўскай апазіцыі, партыйны актыў часцей патрабуе ад пролетарскага суда расдавіць контрраволюцыйную гадзіну.

Ад даромных спроб Зіноўева, Каменева сказіць вучэнне Маркса-Леніна-Сталіна падонкі зіноўеўскай апазіцыі прышлі да прамой здрады соцыялістычнай радзіме, да стварэння падпольнай, антысовецкай тэрарыстычнай групы — такава логіка фракцыйнай барацьбы, такі шлях контрраволюцыянераў і іх натхніцеляў.

Спрэл ворага, аднаго з паследышпаў контрраволюцыйнай зіноўеўскай апазіцыі, у тав. Кірава — стойкага змагара за генеральную лінію партыі, разграміўшага ідэйна і палітычна ленінградскую групу былых зіноўеўцаў — сарваў маску хлусліваў запэўненняў у вернасці партыі, выкрыў пигатгадовую мережа-подпую двурушніцкую антыпартыйную контрраволюцыйную работу зіноўеўскай апазіцыі.

Няма літасці нучцы перараджэнцаў з ахвосця контрраволюцыйнай трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі, якія сказіліся ў лагер штатных катаў, што ўслужліва выконваюць загады агалцелай замежнай белагвардзейска-фашысцкай банды ворагаў пролетарскай дзяржавы.

Былыя «правадыры» ленінградскай апазіцыі, ідэйныя натхніцелі ахвосцяў і здраднікаў справе революцыі — Зіноўеў, Каменеў і інш. — выклікаюць у нас пагарду і нянавісць. І яны павінны панесці суровую кару, як прамыя падсобнікі класавага ворага.

Ніякай літкіх забойцы з-за вугла ведаюць, што іх стаўка на змену цяперашняй палітыкі ў духу зіноўеўска-трацкісцкай платформы бітва вяспыяна ўзрастаючай магутнасцю згуртавання працоўных мас вакол ВКП(б) і яе сталінскага кіраўніцтва.

Ніякая подласць класаварожых сіл не паверне назад пабеднаснае соцыялістычнае будаўніцтва.

Разам з усёй партыяй партыйны актыў часцей на мерэжую вылазку класавага ворага адказвае яшчэ большым згуртаваннем вакол ленінскага ЦК і любімага таварыша **Сталіна**, яшчэ большым узмацненнем работы на ўсіх участках нашай барацьбы за соцыялізм, указаннем баявой мабілізацыі часцей узмацненнем класавай пільнасці, каб ніякая гадзіна не магла прыняцці школы справе нашай рэвалюцыі, нашай дарагой соцыялістычнай радзіме.

На прадпрыемствах Менска адбыліся мітынгі, на якіх абгаварэлася паведамленне Народнага камісарыята Унутраных спраў СССР аб арганізатарах забойства С. М. Кірова.
НА ЗДЫМКУ — мітынг на электрастанцыі.

Комсамольскі актыў Масквы вынес суровае асуджэнне здраднікам соцыялістычнай радзімы

МАСКВА, 25 снежня (БЕЛТА). 23 снежня адбыўся сход комсамольскага актыва Масквы, прасвечаны вынікам пленума ЦК ВКП(б) і снежаньскага абяднанага пленума МК і МГК. Сход ушанаваў уставаннем памяць таварыша **Кірава**. Бурнай авацыяй і крыкамі «ура» была спаткана прапанова выбраць у ганаровы прэзідыум тт. **Сталіна, Молатава, Кагановіча, Варашылава, Калініна, Арджанікідзе, Куйбышэва, Андрэева, Касіора, Мікаяна, Чубара, Петроўскага, Постышэва, Рудзутака, Жданава, Тэльмана і Косарэва.**

З дакладам аб выніках пленума ЦК і снежаньскага пленума МК і МГК выступіў тав. **Хрушчоў**. Заключныя словы т. Хрушчова аб тым, што Маскоўская арганізацыя ВЛКСМ была, ёсць і будзе верным аплотам ЦК ленінскай партыі, бурнымі апладысментамі і выгукамі: «Няхай жыве наш любімы правадыр т. Сталін!» Гістарычныя рашэнні пленума ЦК партыі атрымалі адназгодлівае адабрэнне сходу. Моладзь сталіцы вынесла сваё суровае асуджэнне здраднікам соцыялістычнай радзімы, падонкам былой зіноўеўскай апазіцыі, забойцам т. Кірава, і іх ідэйным натхніцелям. Актыў заклікаў комсамольцаў Масквы да яшчэ большай пільнасці і патрабаваў самай суровай расправы з подлымі ворагамі. Сход паслаў прывітанні ЦК ВКП(б)—т. **Сталіну, МК—т. Кагановічу.**

ЯШЧЭ ЦЯСНЕЙ ЗГУРТУЕМСЯ ВАКОЛ ПАРТЫІ І ЛЮБІМАГА СТАЛІНА

(Завод імя Молатава).

Рабочыя завода **імя Молатава** ў прынятай рэзалюцыі заяўляюць:

«Спраўляць у правадыроў рабочага класа, серца яго — партыі — могуць толькі заклятыя ворагі працоўных. Подлыя падонкі былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы выкрыты з нашых радоў таварышам **Кірава.**

Яны нанеслі цяжкі ўдар партыі, але гэта ўтрата яшчэ больш згуртуе нашы рады, яшчэ шчыльней згуртуе нас вакол партыі і нашага любімага **Сталіна.**

Рабочы калектыў завода ўхваляе пастанову прэзідыума ЦВК Саюза ССР ад 1 снежня і патрабуе бязлітаснай расправы з забойцамі таварыша Кірава.

Вышэй рэвалюцыйную пільнасць у нашых радах».

МЕНСК

БУДЗЕМ ДАСТОЙНЫМІ ІМЯ тав. КІРАВА

(Машынабудаўнічы завод імя Кірава).

Заслухаўшы паведамленне аб арышце кіраўнікоў былой зіноўеўскай апазіцыі, рабочыя завода імя тав. **Кірава** аднадушна адабраюць гэту меру, бо не можа быць ніякай літасці да ворагаў рабочага класа, выступаючых супроць нашага пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва.

Яны выкрылі, гэтыя жалкія, выкінутыя з калёг гісторыі, падонкі разбітай трацкісцка-зіноўеўскай апазіцыі. Ім ніколі не спыніць пераможнага шэсця соцыялізма, ім ніколі не спыніць нашу барацьбу за канчатковую перамогу справы партыі Леніна-Сталіна.

Яны выбралі апошні сродак — сродак людзей жалкіх і асуджаных—стрэлам з-за вугла імкнуцца дасягнуць недасяжнага, бо нікому ніколі і ніякімі сродкамі не ўдасца звесці нас з дарогі, па якой мы ідзем пад кіраўніцтвам нашай партыі.

Імя жалезнага Кірава мы пагасем як сцяг у барацьбе за генеральную лінію нашай партыі, за справу Леніна-Сталіна!

Ніякай літасці ворагам соцыялістычнага будаўніцтва!

БУРА ГНЕВУ І АБУРЭННЯ

(Фабрыка імя Кагановіча)

Паведамленне Народнага Камісарыята Унутраных Спраў аб раскрыцці «Ленінградскага цэнтра», дзе групаваліся падонкі былой зіноўеўскай апазіцыі—забойцы таварыша Кірава—выклікала гнеўнае абурэнне сярод рабочых мінскай абутковай фабрыкі **імя Кагановіча.**

Адразу па цэхах, зменах былі праведзены сходы. На першай зменае праведзен пазітызень, на другой зменае мітынг.

Старая работніца штампавальнага цэха тав. **Каган** з абурэннем гаварыла аб здрадніках. Яна патрабавала расстрэлу тых, хто падняў подлую руку на Сергея Міронавіча Кірава, яна патрабавала суровага пакарання натхніцеляў забойства.

У прынятых рэзалюцыях рабочыя фабрыкі заяўляюць: «Мы, рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі фабрыкі імя Кагановіча, як і ўвесь рабочы клас і працоўныя масы ўсяго света, заяўляем, што ні подлае забойства таварыша Кірава, ні іншыя праваканцыі класавага ворага не спыняць пераможнага шэсця соцыялізма, ні на адно імгненне не пахісунуць нашай веры ў правільнасць генеральнай лініі партыі, не дэзарганізуюць нашых радоў. Мы яшчэ больш згуртуемся вакол вялікага сцяга Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, вакол нашай большэвіцкай партыі, нашага любімага правадыра і настаўніка, дарагога таварыша Сталіна.

СМЕРЦЬ ЗДРАДНІКАМ

(Фабрыка «Октябр»)

Рабочы калектыў **чырвонасцяжнай швэйнай фабрыкі «Октябр»** кляйміць пракляцьцем подлых здраднікаў з антыпартыйнай зіноўеўскай групы, вырваўшы з нашых радоў лепшага сына нашай партыі, лепшага сакратніка таварыша Сталіна.

Патрабуем ад ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР прымяніць да тэрарыстычнай контрраволюцыйнай групы вышэйшую меру соцыяльнай абароны, патрабуем суровай і бязлітаснай расправы з астаткамі разбітых антыпартыйных груп.

Рабочы калектыў запэўнае партыю і яе вялікага кіраўніка таварыша Сталіна, што ў адказ на гнуснае выступленне подлых падонкаў зіноўеўскай апазіцыі рабочыя яшчэ больш згуртуюць свае рады вакол ленінскай партыі і яе Цэнтральнага Камітэта.

Мы яшчэ больш узнімем класавую пільнасць і па-ўдарнаму будзем змагацца за выкананне промфінплана, за высокаякасную прадукцыю, за асваенне новых фасонаў і асартыментаў для лепшага задаволення ўзросшых патрабаванняў рабочага і калгасніка.

ПРЫВІТАННЕ З'ЕЗДА СОВЕТАЎ ЯЎРЭЙСКАЙ АЎТАНОМНАЙ ВОБЛАСЦІ

ЦК КП(б)Б — т. ГІКАЛО
ЦВК БССР — т. ЧАРВЯКОВУ,
СНК БССР — т. ГАЛАДЗЕДУ.

Першы з'езд советаў Яўрэйскай аўтаномнай вобласці з вялікай радасцю і натхненнем прыняў прывітанне праз вашу дэлегацыю ад вас, кіраўнікоў брацкай Беларускай рэспублікі. Ваша шэфства бэць заруча вялікага росквіту на шай вобласці. Няхай жыве брацтва ўсіх нацыянальных рэспублік і абласцей нашага вялікага Совецкага Саюза.

Няхай жывуць кіраўнікі БССР — **т.т. Гікало. Чарвякоў, Галадзед!**

ЧАКАЕМ АДКАЗУ СПРАВАЙ!

У той час, калі асобныя МТС, як Любаньская, Буда-Кашалёўская, Капыльская і інш. па-большэвіцку разгарнулі рамонт трактароў і вывакалі больш двух трэцей гадавога плана рамонту, рад МТС правальваюць рамонт трактарнага парка.

Асабліва ганебна зрываюць рамонт трактароў наступныя МТС:

Путчынская.	Дырэктар Маеў.	Нач. палітаддзела	Каркінаў.
Жыткавіцкая.	Дырэктар Уласевіч.	Нач. палітаддзела	Гербуноў.
Бориавіцкая.	Дырэктар Цыкуноў.	Нач. палітаддзела	Калядо.
Попацкая.	Дырэктар —	Нач. палітаддзела	Берэін.
Асвейская.	Дырэктар Радзіёнаў.	Нач. палітаддзела	Эйдзінаў.
Ушацкая.	Дырэктар Мізін.	Нач. палітаддзела	Віхраў.
Высачанская.	Дырэктар Нарвенка.	Нач. палітаддзела	Стронгін.
Імя Тэльмана, Мсціслаўскага раёна.	Дырэктар Казлоў.	Нач. палітаддзела	Мерцінкоўскі.
Хоцімская.	Дырэктар Берын.	Нач. палітаддзела	—
Большэвіцкая, Менскага раёна.	Дырэктар Квітня.	Нач. палітаддзела	Каменштэйн.
Крычаўская.	Дырэктар Архімаў.	Нач. палітаддзела	Харпеп.

У гэтых МТС яшчэ нават не выпусцілі з рамонту ні аднаго трактара.

Мы ставім рубам пытанне перад дырэктарамі гэтых МТС, дакуль яны будуць працягваць сваё грубейшае ігнараванне рашэнняў партыі і ўрада аб рамонце трактароў, што прадпрынялі начальнікі палітаддзелаў гэтых МТС для таго, каб ліквідаваць гэты ганебны прарыў. Нарэшце, мы ставім пытанне перад Наркамземам, што ім прадпрынята ў адносінах да зрыўшчыкаў выканання важнейшых рашэнняў партыі і ўрада.

Адказ канкрэтнымі справамі, высокаякасна адрэмантаванымі трактарамі мы чакаем ад дырэктароў, начальнікаў палітаддзелаў гэтых МТС і Наркамзема.

БАРЫСАЎСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ВЫКАН ПА ГАДАВЫ ПЛАН

ЦК КП(б)Б—тт. ГІКАЛО. ВАЛКОВІЧУ.
ЦВК БССР—тав. ЧАРВЯКОВУ.
СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ.
ЦСПСБ—тав. КАВАЛЬЧУКУ.
ЦО «ЗВЯЗДА», ГАЗЕЦЕ «РАБОЧИЙ».

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, выконваючы ўзятыя абавязацельствы ў вытворчым паходзе імя VII з'езда советаў СССР і XI з'езда советаў БССР, шырока разгарнуўшы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, прамысловасць Барысаўскага раёна на 24 снежня выканала гадавое заданне промфінплана на 100,6 проц. (план 28.828.500 руб., выканана — 29.005.000 руб.), прамаперацыя выканала промфінплан на 104,5 проц. (план 4.408.500, выканана 4.611.900 руб.).

Мабілізуем усе сілы на выкананне промфінплана кожным прадпрыемствам, цэхам, брыгадай.

Сакратар Барысаўскага РК КП(б)Б ЧАРНЫШОЎ.
Старшыня РВК БАРАНЧЫК.
Старшыня райпрофсавета РЫКЛІН.

АДКРЫЎСЯ МЕНСКІ РАЁННЫ З'ЕЗД СОВЕТАЎ

Вялікая зала Дома партактыва выглядае сёння святочна.

Старшыня аргбюро РВК т. Жарын адкрывае менскі раённы з'езд советаў. Першае слова аб вялікай утрыце, якую панесла партыя і працоўныя масы краіны—аб Кіраве, жыцці якога вырвала подлымі падонкамі контрраволюцыйнай зіноўеўскай апазіцыі. З'езд ушаноўвае памяць таварыша Кірава ўставаннем.

— Менскі раён пад кіраўніцтвам гаркома партыі, пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК на чале з тав. Гікало заваёўвае адно з першых месц у Беларусі і ў Саюзе, заслужыўшы вялікі гонар — быць занесеным «Правдой» на ўсесаюзную чырвоную дошку і атрымаць пераходны чырвоны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК. Гэта нас абавязвае не толькі не самасупакойвацца, а наадварот—з яшчэ большым энтузіязмам і ўпартасцю змагацца з малейшымі недахопамі ў рабоце, за большэвіцкія калгасы, за жывёлагадоўлю, за заможнае калгаснае жыццё.

***

Выбраныя кіруючыя органы з'езда. У прэзідыуме 35 чалавек. Сярод іх: Валковіч, Галадзед, Чарвякоў, Ляўкоў, Картукоў, Рыскін, Ленцнер, Хадасевіч, Варончанка, Жарын, Турэцкі, Жуковіч, Галкоўскі і іншыя.

З вялікім уздымам праходзяць выбары ганаровага прэзідыума ў складзе тт. Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава, Орджанікідзе, Андрэева, Мікаяна, Куйбышэва, Касіора, Жданава, Тэльмана, Гікало, Максіма Горкага і Будзённага. З асабліва незмаўкальнымі апладысментамі сустракае з'езд першае прэзідыума ганаровага прэзідыума — таварыша Сталіна. У зале раздаюцца воклічы «Няхай жыве правадыр совецкага пролетарыята тав. Сталін!». Гучным, многагалосным «ура» адказвае ўвесь з'езд.

З прывітальнай прамовай ад ЦК КП(б)Б і ЦВК выступіў старшыня ЦВК СССР і БССР тав. Чарвякоў.

Тав. Чарвякоў ахарактарызаваў галоўныя задачы раённага з'езда советаў у сувязі з апошнімі пастановамі лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б).

— Мацаваць гаспадарча і палітычна на калгасы, утягваць у калгасы астатнюю частку аднаасобнікаў, вычышчаючы з сваіх радоў кулацкія элементы, разгортваць жывёлагадоўлю, асабліва конегадоўлю, выхоўваць і высоўваць лепшых актывістаў і ў прыватнасці жанчын — галоўная задача.

Ад ГК КП(б)Б тав. Хадасевіч заклікаў з'езд з большэвіцкай дзелавітасцю адлесіцца да вырашэння пастаўленай парадку дня.

Ад Н-скай дывізіі вітае з'езд тав. Владзіміроскі. Ён рапартуе аб вялікіх поспехах у баявой і палітычнай падрыхтоўцы байцоў.

Трэба было бачыць, з якой любоўю, натхненнем, стоячы, сустрэў і праводзіў з'езд слаўных байцоў, як адзін за другім леслі з залы прывітаньні і воклічы «ура» ў гонар Чырвонай арміі і жалезнага наркома Кліма Варашылава.

Аб росце добрабыту калгасаў гаварылі калгаснікі Малашэвіч (калгас «Першая конная»), Дулькевіч («Комінтэрн») і Ольга Вортнік (калгас «Новы быт»). І як-бы ў доказ сваіх гаспадарчых поспехаў, яны ведомсілі з'езду падарункі—алтыны, масла пірагі, сыры, мяса, масла і інш.

Ад рабочых горада Менска з'езд вітаў тав. Александровіча.

З'езд паслаў прывітальныя тэлеграмы тт. Сталіну, Молатаву, Калініну, Варашылаву, Гікало, ЦВК і СНК БССР.

На тэмы дня

КІНО У КАЛГАС

Тав. **Сталін** назваў кіно «найважнейшым сродкам масавай агітацыі». Доба ведома, якое вялікае значэнне надаваў кінематаграфіі тав. **Ленін**. Толькі ў нашай краіне кіно атрымала сапраўды магутнае развіццё. У нашай краіне кіно не сустракае ніякіх перашкод да прасоўвання ў самыя глухія вёскі, у самыя шырокія масы. Вось чаму нават вялікія поспехі нашага кіно нас ужо сёння задаволіць не могуць.

Праз некалькі дзён мы будзем адзначаць дваццацігоддзе кінематографіі Савецкай Беларусі. З вялікімі дасягненнямі прыходзіць Беларяржкіно да свайго юбілея ў справе разгортвання гарадской і вясковай кіносеткі. У 1925 годзе ў нас было толькі 63 кіноўстаноўкі, а ў 1934 годзе кіносетка вырасла да 1227 адзінак, у тым ліку 567 вясковых кіноўстановак, якія могуць прапусціць з мільёну глядачоў у год. На працягу другой пяцігодкі колькасць вясковых кінаперасовак павінна павялічыцца да 1476.

Такім чынам перад нашымі кінаарганізацыямі побач з пытаннямі колькаснага росту з усёй строгасцю паўстаюць пытанні якаснага аслужвання і радыяльнага скарыстання завезенага ў раёны і вёскі кінаабсталявання для таго, каб яно сапраўды абслугоўвала культурныя інтарэсы шырокіх мас. А тут у нас справа абстаіць надзвычай дрэнна.

У Полацкім адділенні Беларяржкіно апаратура раскідана па школах і дзіцячых дамах. Два месяцы працавала перасоўка механіка Фаліскова ў Полацку ў яўрэйскім дзіцячым доме і ніхто не з'яўляўся, каб яе атрымаць. Выпадковы шофер знайшоў на дарозе дынамо, пакінутае кінамеханікам Захаранка. Доўгі час у Полацку на пошце валялася дынамо, прыбыўшае на адрас аддзялення. І гэта непасрэдна ў раённым цэнтры, там, дзе знаходзіцца аддзяленне Беларяржкіно.

У Лозве кінатэатр у раённым цэнтры на замку. Раённы аддзел асветы не зацікаўлен і не хоча зрабіць у тэатры патрэбны рамонт. І вось з гэтай прычыны моладзь шындае па вуліцах, не маючы дзе культурна адпачыць.

Яшчэ горш у раёнах. Загадчык Ардзянскай хаты-чытальні (Шкловўшчына) тав. Дзівакоў скарэціцца, што ўсе парогі абіў ён у раўсе, дабіваючыся, каб да іх прыехала кінаперасоўка. Але дарма. Частка перасовак працуе, а большасць з-за несвоўнасці механікаў прастойвае ў рамонце.

У справе абслугоўвання насельніцтва кіноўстаноўкамі мы пераходзім у вышэйшы клас. Урад паставіў перад кінаарганізацыямі канкрэтную задачу — агучыць да лістапада 1935 года 900 вясковых кіноўстановак, у тым ліку 20 на БССР. Такім чынам з'яўляецца магчымасць пусціць на калгасны і саўгасны экран такія шедэўры кінамастацтва, як «Чапаеў» і інш. карціны. Але гэта ні ў якім разе не азначае аслаблення работы нашай кіносеткі, працуючай на нямых карцінах.

Абавязак усіх кінаработнікаў — дабіцца мінімальнага прастою кінопасовак у рамонце, што дасць нам магчымасць пры наяўным абсталяванні мінімум у два разы павялічыць колькасць абслугоўваемых пунктаў. Лепшым скарыстаннем кінаперасовак мы зможам ужо сёння ў значна больш разоў палепшыць абслугоўванне калгаснага і саўгаснага глядача.

Аб заключэнні дагавароў на 1935 г.

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

У адпаведнасці з пастановай СНК СССР ад 14 снежня 1934 г. № 2712 «Аб заключэнні дагавароў на 1935 год», Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Ускласці адказнасць за своечасовае і правільнае заключэнне дагавароў на 1935 год па гаспадарчых арганізацыях:

НК Мясцпрома—па т. Балціна, НК Харчпрома—т. Геаргадзе, НК Калгаса—т. Амбражуласа, НК Леспрома — т. Розіна, НК водзнага транспарта—т. Пачобута, Белкаапцрамсовет — т. Бяньковіча, Белжылсаюза—т. Разуева, НК сувязі—т. Валодзька, НК унутранага гандлю—т. Гурэвіча, НК земляробства—т. Бенека, НК цяжпрома — т. Нюневіч, НК соўгасаў — т. Жолудава, Белкаапсаюза—т. Бас кіна, Белкааплеспромсаюза—т. Катаводава, Галоўдартранса—т. Іванова, НК легпрома—т. Пехцерава.

2. Абавязаць народныя камісарыяты, цэнтральныя ўстановы БССР і кааперацыйныя цэнтры, пачынаючы з 1 студзеня 1935 г., прадстаўляць штодзённа Дзяржаўнаму арбітражу пры СНК БССР справаздачнасць аб ходзе заключэння дагавароў па падведамственых ім гаспадарчых арганізацыях.

3. У канцы лютага месяца 1935 г. заслухаць на СНК даклад галоўнага арбітра аб выніках заключэння дагавароў на 1935 г.

Нам. старшыні Совета Народных Камісараў БССР
А. СААК'ЯН.

Кіраўнік спр ў Совета Народных Камісараў БССР
С. ШАБАЛТАС.

АБ ГОРАЦКІМ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае, што Горацкі сельскагаспадарчы інстытут, які складаецца сабой буйнейшую навуковую адзінку і мае ўсе магчымасці быць перадавым інстытутам, да апошняга часу, яшчэ не ўзняў сваёй практычнай работы на ўзровень пастаўленых перад ім задач па падрыхтоўцы кадраў соцыялістычнага земляробства.

Кіраўніцтва інстытута (дырэкцыя, партком, прафком), замест максімальных клопатаў аб патрэбах студэнтаў, замест масавай палітыка-выхаваўчай работы і большэвіцкай барацьбы за паспяховую арганізацыю вучобы, пачало памяж сабой бяспрынцыпнае склочніцтва і ослабла ўвагу да пытанняў быту і культурных патрэб студэнцтва, часта бюракратычна адмахваючыся ад раду запросаў студэнцтва, не зрабіўшы для сябе дастатковых высноў з пастановы ЦК ВКП(б) аб Новачаркаскім індустрыяльным інстытуце і рашэння ЦК КП(б)Б ад 27 верасня 1933 г. аб становішчы Горацкага інстытута.

Дырэкцыя інстытута (Барысевіч і Ізэуітаў) таксама стала на шлях абману кіруючых органаў і змазвання абураючых недахопаў у справе матэрыяльна-бытавога становішча, культурна-палітычнага абслугоўвання навучаючыхся і прарываў у навучальна-выхаваўчым працэсе.

Інтэрнаты, сталоўкі, дзіцячы сад і большасць навучальных памяшканняў інстытута знаходзяцца ў выключна антысанітарным становішчы.

Замест максімальных клопатаў аб карчаванні студэнтаў і скаўжанні навуковых кадраў дырэкцыя дапускала растранжыраванне прадуктаў і самаснабжалася.

Вучэбна-выхаваўчая работа інстытута пастаўлена незадавальняюча. Дырэкцыя не аддавала ўвагі кафедрам зоатэхнікі, зоалогіі і генетыкі сельска-гаспадарчай жывёлы.

Выключна дрэнна пастаўлена ў інстытуце партыйная, комсамольская і прафесіянальная работа. Партком, комсамольскі калектыў і прафком правялі поўную бесклапотнасць да бытавых патрэб студэнтаў і да палітычна-масавай работы ў інстытуце і зусім недастаткова рэагавалі на факты хваравітых з'яў і хуліганства сярод студэнтаў інстытута.

Усё гэта з'явілася рэзультатам антыпартыйных метадаў работы кіраўніцтва інстытута, і ў першую чаргу дырэкцыі (Барысевіч, Ізэуітаў), а таксама зусім недастатковай увагі інстытуту з боку Горацкага райкома КП(б)Б і Наркамзема БССР.

Бюро ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. За бяздушныя фармальныя адносіны да штодзённых патрэб студэнтаў, за грубасць, няўменне змагацца з праяўленнямі бюракратызма ў кіруючым апараце інстытута і невыкананне рашэнняў ЦК ад 27 верасня 1933 г.—зняць з работы дырэктара інстытута тав. Барысевіча і накіраваць на менш адказную работу, адмяніўшы рашэнне ЦК аб камандзіраванні яго ў аспірантуру.

2. За адсутнасць палітычна-масавай выхаваўчай работы сярод студэнцтва і перагаварванне на агітнасці ў інстытуце—зняць з работы сакратара парткома тав. Школьніка.

3. За бяздзейнасць, склочніцтва і незабеспячэнне навуковадаследчай работы ў інстытуце—зняць, як не справяўшагося з работай, нам. дырэктара тав. Ізэуітава, абвясціць яму суровую вымову і накіраваць яго на нізавую работу.

4. За агіднае становішча інтэрнатаў і сталовых, за бюракратычнае кіраўніцтва і безадказныя адносіны да гаспадаркі—зняць з работы нам. дырэктара па гаспадарчай частцы Сільянава і аддаць пад суд. Намеснікам дырэктара па гаспадарцы інстытута назначыць тав. Райгольда (учапчаважанага ЦСПСБ па Горацкаму раёну).

Зняць з работы старшыню ЗСК Барабанава.

5. За адсутнасць масава-выхаваўчай работы і бесклапотнасць да бытавых патрэб студэнцтва распусціць прафком і зняць з работы старшыню прафкома. Абавязаць ЦСПСБ умацаваць прафком інстытута.

6. Прапанаваць ЦК ЛКСМБ дасканала ацаніць становішчам комсамольскай работы ў інстытуце і ўзмацніць кіраўніцтва комсамольскай арганізацыяй буйным работнікам. Устанавіць платную адзінку сакратара камітэта ЛКСМБ.

7. Указаць сакратару Горацкага райкома КП(б)Б тав. **Вільчку** на адсутнасць з боку РК дастатковага партыйнага кіраўніцтва і дапамогі інстытуту, а таксама перагаварванне своечасова на хваравітыя з'явы ў інстытуце. Папярэдзіць Горацкі РК, што ЦК не пацерпіць у далейшым спроб якога-б там ні было ўхілення ад вырашэння тых ці іншых пытанняў інстытута.

8. Указаць Наркамзему БССР на недастатковае кіраўніцтва інстытутам і прапанаваць НКЗБ і кіраўніцтву інстытута забяспечыць выкананне рашэння бюро ЦК ад 27 верасня 1933 г., аддаўшы асаблівую ўвагу матэрыяльна-бытавым пытанням студэнцтва, неадкладна арганізаваўшы скончэнне падрыхтоўкі інтэрнатаў і неабходны рамонт аўдыторый і карпусоў інстытута.

9. Прапанаваць кіраўніцтву інстытута (дырэкцыя, партком) забяспечыць найлепшую пастаноўку партыйна-масавай і вучэбна-выхаваўчай работы, каб інстытут стаў узорнай сельска-гаспадарчай навучальнай установай у Совецкім саюзе і выпускаў высокакваліфікаваныя, палітычна-вытрыманыя і культурна развітыя кадры соцыялістычнага земляробства.

10. Абавязаць Наркомуготгандаль (тав. Гурэвіча) рэалізаваць неадкладна рашэнні ЦК аб снабжэнні навуковых работнікаў і студэнтаў Горацкага інстытута.

11. ЦК КП(б)Б ставіць перад гаркомамі і райкомамі КП(б)Б, перад усімі наркаматамі і аддзеламі ЦК задачу рашучага ўзмацнення ўвагі да пытанняў матэрыяльнага і культурна-палітычнага абслугоўвання студэнцтва, умацавання вучэбнай дысцыпліны, узмацнення кіраўніцтва інстытутамі і тэхнікумамі, забяспечваючы павышэнне ролі і аўтарытэта дырэктароў навучальных устаноў.

12. Гэта рашэнне прапрацаваць на ўсіх партыйных і навучальных устаноў і наркаматаў, зрабіўшы неабходныя высновы.

Акадэмік ГАУСМАН — дэпутат менскага горсовета.

З'ЕЗД, ЯКІ ПРАЙШОЎ ПАД ЗНАКАМ БОЛЬШЭВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ

ПОЛАЦК. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

87 процантаў усёй зямлі Полацкага раёна да рэвалюцыі належала памешчыкам і духавенству. 8 процантаў зямлі знаходзілася ў руках кулакоў. 98 проц. беднякоў і сераднякоў раёна мелі толькі 5 процантаў зямлі.

Полацк гэта быў горад купцоў і духавенства. Цэрквы і манастыры з'яўляліся «культурнымі» ачагамі горада і раёна.

17 год існавання савецкай улады змянілі выгляд раёна. Асабліва змяніў сваё аблічча раён за апошнія тры гады. На месцы старых кулацкіх і памешчыцкіх фальваркаў і маёнткаў вырас 251 калгас. Тры прыходскія школы і дзесяць народных вучылішч меў раён у мінулым. Шэсць тэхнікумаў, 45 поўных і нявопўных сярэдніх школ, больш сотні пачатковых школ, у якіх навучаюцца 10 тысяч дзяцей, вось што мае Полацкі раён к свайму з'езду советаў.

Аб тым, што на калгасных палях працуюць 97 трактароў, 578 складаных сельскагаспадарчых машын, дакладваў у сваёй справаздачы старшыня райвыканкома тав. Кузьмін.

Расказваў таксама тав. Кузьмін, што Полацкім райкомам за пяць дзён да з'езда выканана на 20 дзён раней, чым у мінулым годзе, план льнозагатовак, што ў гэтым годзе на некалькі сотень цэнтнераў льну адана больш, чым у мінулым годзе.

Гэтага раён дабіўся таму, што ў часе перавыбораў 12 проц. аднаасобных гаспадарак уступілі ў калгасы раёна, што за гэты час арганізавана 95 новых калгасаў, у якія ўступіла 1.500 аднаасобных гаспадарак.

Не забыў тав. Кузьмін сказаць і аб тым, што сам раённы выканаўчы камітэт і яго аддзелы новымі калгасамі слаба кіруюць. Той факт, што ў Семяненскім сельсавеце ў новыя калгасы трапілі кулакі, больш чым 60 процантаў нова-арганізаваных калгасаў. Яшчэ не засмыпана насенне. Аб тым як у раёне пастаўлена справа жывёлагадоўлі з'езду дакладваў тав. Грышанаў.

Даклад тав. Грышанава з'яўляўся сапраўды ўзорам, як трэба дакладваць гаспадару раёна. Праўда, даклад быў крыху дэтэтавт, але Грышанаў змог апрача справаздачы расказаць дэлегатам з'езда, якія канкрэтныя перспектывы стаяць перад раёнам і перад асобнымі сельсоветамі. На вопыце аднаго калгаса тав. Грышанаў паказаў дэлегатам, што дае чэсная работа ў калгасе, а на вопыце другога паказаў работу класавага ворага. Асабліва многа тав. Грышанаў спыніўся на пытанні палянцкіх ўрадлівасных ільну. Замест 2 цэнтнераў выхаду ільну з гектара ў 1961 годзе, у 1934 г. цэнтнер даў 3,95. Але гэтага мала. Зямля Полацкага раёна можа даць значна больш.

Самакрытычны аналіз тав. Грышанаў даў становішчу жывёлагадоўлі на раёну. Пагалоўе авечак, свіней і коней усё яшчэ знижаецца. Першыя дні ацёлу паўтараюць леташнюю карціну, калі маладняк дзе адразу пад нож.

Выступіўшыя 65 дэлегатаў як на дакладу тав. Кузьміна, так і на дакладу тав. Грышанава асабліва спыняліся на недахопах у работе РВК і яго аддзелаў. Нямала дэлегатаў гаварылі аб работе кааператыўных арганізацый. Старшыня Нашкага сельсавета тав. Лошцін расказаў з'езду, як райсаюз кіруе сельпо. Растраты ў сельпо прынялі «планавы» характар. Той факт, што за год па райсаюзу растрачана сто тысяч рублёў, гаворыць аб тым, што райсаюз не ведае, што робіцца ў сельпо.

Калгасніца калгаса «Окцябр», Гомольскага сельсавета, расказала з'езду, як яна працуючы пяць год пялятніцай, дабілася таго, што не было ні аднаго выпадку адыходу цялят. Тут-жа яна паказала, як дрэнная работа ў калгасе «Іскра», гэтага-ж сельсавета, дала тое, што 15 проц. цялят у мінулым годзе загінула.

Старшыня памежнічага Шпакоўшчынскага сельсавета тав. Фельнеева сказаў: Шпакоўшчынскі сельсавет увесь час быў на чорнай дошцы. Цяпер, калі новае кіраўніцтва адолела ўцягнуць у работу сельсавета ўсіх членаў і ўпоўнаважаных дзесяцідворак, сельсавет поўнасцю выканаў свае абавязацельствы па хлебазакупках і па іншых відах.

Большасць дэлегатаў спынялася на тым, што да гэтага часу як райвыканком, так і сельсоветы працуюць урыўкамі і кампанейскі. Той факт, што Полацкі раён адстае на выкананню фінплана і па хлебазагатоўках, гаворыць аб тым, што кампанейскі працуе большасць сельсоветаў раёна.

У сваіх выступленнях дэлегаты з'езда і асабліва пагранічных сельсоветаў патрабавалі ад раённага выканаўчага камітэта больш рэвалюцыйнай пільнасці і больш пролетарскай зорнасці ва ўсёй сваёй рабоце. З'езд у сваіх рашэннях далучыўся да дадатках, унесеных ленінградцамі ў свой наказ, і даручыў райвыканкому дабіцца таго, каб усе ма-

Рабочы-ўдарнік шэйнай фабрыкі «Окцябр» тав. ГОЛУБ—стары дэпутат менскага горсовета. Тав. Голуб выбран у новы склад горсовета.

НОВАМУ РВК УЛІЧЫЦЬ УКАЗАННІ ДЭЛЕГАТАЎ З'ЕЗДА

МОЗЫР. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Мазырчына да свайго раённага з'езда прышла з поўным завяршэннем плана льнозагатовак і хлебазакупак. Да правядзення з'езда раённыя арганізацыі падрыхтаваліся надрэнна. На з'езд з'явіліся 284 дэлегаты з ліку выбраных 288. У гонар з'езда прапоўныя горада арганізавалі 3-тысячную дэманстрацыю. З'езд віталі дзесяткі дэлегатаў рабочых і калгаснікаў перадавых прадпрыемстваў і калгасаў. 23 рабочых і калгаснікаў падані на з'езд заявы аб прыёме іх у спачуваючыя і 6 аднаасобнікаў аб прыёме ў калгас.

Дэлегаты прымалі актыўны ўдзел у абмеркаванні і вырашэнні пытанняў, якія стаяць на парадку дня з'езда. Па ўсіх дакладах выступіла у спрэчках 81 чал. Больш паловы з іх—пізаўныя работнікі сельсоветаў і калгасаў, што сведчыць аб росце палітычнай свядомасці прапоўных мас Мазырчыны.

Рад дэлегатаў, радавых калгаснікаў і калгасніц, расказалі з'езду як яны ўжо ў гэтым годзе дабіліся заможнага і культурнага жыцця. Дэлегатка Украінец Мар'я (калгасніца калгаса імя Молатава, Крупавіцкага сельсавета) расказала як яна за 4 гады ўдарнай работы ў калгасе стала заможнай.

Да ўступлення ў калгас жыла я вельмі дрэнна, не мела ні хлеба, ні бульбы. Жывёлы таксама не было. І толькі ў калгасе, пры дапамозе совецкай улады, я набыла карову і маю дробную жывёлу. У гэтым годзе я разам з усёй сям'ёй выпрацавала больш 900 працадзён, на якія атрымала 120 пудоў зарне і 350 пудоў бульбы. Зараз я амаль стала заможнай.

Дэлегаты, пізаўныя работнікі, не толькі дзяліліся вопытам сваёй работы, але і жорстка крытыкавалі недахопы райвыканкома і яго аддзелаў. Старшыня сельсавета тав. Лянскі прывёў характэрны факт гаспралёрства і «очковтирательства» ў работе інструктара РВК Ліпшыца, які, прасядзеўшы ў калгасе «Чырвоны жывёлавод» Бабрыянскага сельсавета, два дні, нічога не зрабіў, а ў РВК паведаміў, што наладзіў работу дэпутацкай групы, якая і па сённяшні дзень не існуе.

Асабліва жорстка была раскрытыкавана работа райзага. Адзін той факт, што гэты важнейшы аддзел РВК больш года «прачаваў» без на-

гадчыка, якга сведчыць аб тым, што кіраўніцтва з боку РВК у справе культурнага будаўніцтва ў раёне было дрэнным. Многія школы сустрэлі навучальны год непадрыхтаванымі. Рад з іх яшчэ і зараз не забяспечаны апалам.

Указалі дэлегаты і на слабыя бакі работы райвыканкома. Амаль нічога яшчэ не зрабіў райсавет па забеспячэнню і замацаванню новага прыпліву, слаба ідзе падрыхтоўка да вясны. Сектар райсавета па кіраўніцтву жывёлагадоўлі таксама працуе незадавальняюча. Хоць па буйнай рагатай жывёле і свінях у раёне ёсць пехатоны прырост, затое па авечках і конях стала значна паменшылася. Яшчэ і зараз маюць месца факты абартавання кабыліц. Не гледзячы на тое, што ў раёне ўжо пачаўся ацёл, сектар жывёлагадоўлі палец аб палец не ўдарыў, каб распрацаваць гэтым мерапрыемствы па забеспячэнню выжывання маладняка новага ацёлу.

З'езд у асноўным прайшоў надрэнна. Адзнак, нельга абмінуць і сур'ёзных недахопаў у яго правядзенні.

Выбары новага складу райвыканкома кіраўнікі з'езда палічылі чыста фармальнай справай. На выбарах адсутнічала 50 дэлегатаў (17 проц.). Выбары праводзіліся без падліку галасоў, хоць людзі для падліку фармальна і былі выдзелены. Старшыня раённай выбарчай камісіі тав. Жогаў, каб хутчэй правесці выбары, знайшоў «арытмічны» спосаб галасавання. Пры галасаванні «за» галасы падлічвалі і, калі ніхто не галасаваў супроць і не ўстрымліваўся, лічылі, што кандыдатура прайшла аднагалосна. Рабілася гэта з такой паспешнасцю, што дэлегаты ледзь паспявалі падымаць і апускаць мандаты. Падняўшы мандат за 5-6 кандыдатур, многія дэлегаты рашылі больш сабе не затрудняць, бо галасоў ніхто не падлічвае і ўсё роўна будзе лічыцца аднагалосна. У рэзультаце такога «вынаходства» з прысутных у зале 215 дэлегатаў за многія кандыдатуры галасавала не больш 120-150 дэлегатаў? Астатнія або адсяджваліся або ўстрымліваліся, не падымаючы мандата ні за, ні супроць. Аднак, у пратаколах з'езда запісана, што ўсе кандыдатуры прайшлі аднагалосна.

Р. ФРАЛОЎ.

З'ЕЗД ПЕРАМОЖЦАЎ

(Ад карэспандэнта «Звязды»)

Аршанская раённая арганізацыя пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, і асабліва сакратара ЦК тав. Гікало, прышла на свой з'езд советаў з буйнымі дасягненнямі ў галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Раён занесен на ўсесаюзную і ўсебеларускую чырвоныя дошкі, заваяваў месца на ўсесаюзную выстаўку в VII з'езду советаў СССР.

Такія прадпрыемствы (Абіторф, Белдрэс і інш.), якія ўвесь час цягнуцца ў хвосце, прышлі на з'езд рапартаваць аб перазыманні сваіх плянаў.

У галіне сельскай гаспадаркі калгасы становяцца большэвіцкімі, а калгаснікі заможнымі.

У сярэднім на працадзень у 1933 годзе прыпадала 1,9 кг зернавых, а ў 1934 г.—3 кілограмы. Бульбы ў 1933 г.—3 кіло, у 1934 г.—9 кіло. Калгаснік Чаркасаў з калгаса «Х з'езд советаў» былы батрак, мае зараз вялікі «клопат»: куды дзець 300 пудоў хлеба, 850 пудоў бульбы і 800 рублёў, якія ён атрымаў на свае працадні. Савінкая Пелагея атрымлівае на працадні 290 пудоў хлеба і 960 пудоў бульбы. Крукоўскі Аляксандр атрымлівае 210 пудоў хлеба і 560 пудоў бульбы.

Метадамі сацыялістычнага ўдарніцтва разгорнута арганізацыя змагла перавыхаваць калгаснікаў, арабіць адносіны іх да працы «справай гонару і гераізма».

Мацюк Аляксей з калгаса «Хвала рэвалюцыі» быў першым дударам у раёне, а зараз ён з'яўляецца ўдарнікам, і т. д.

Рабочы і калгаснікам Аршаншчыны сапраўды было чым гаварыцца на сваім з'езде і расказаць, чаго яны дасягнулі пад кіраўніцтвам сваёй партыйнай арганізацыі.

Гэтыя дасягненні стварылі ў асобных кіраўніцтвах раёна—Касцюковіча (райсаюз), Галецкага (райсаюз) і асобных старшынь сельсоветаў элементы зазнайства, самасупакаення. Гэта ў сваю чаргу прывяло на асобных участках да страты класавай пільнасці і затрымкі выканання палітычна-гаспадарчых задач.

Толькі за апошнія два месяцы было 55 выпадкаў абартавання кананатак. На з'езд советаў ад Веравойшанскага сельсовета дэлегатам была выбрана дачка кулака.

Фінплан IV квартала па раёну выканан усяго на 82,5 проц. (на 19 снежня). За гэтымі сярэднімі лічбамі хаваюцца такія сельсоветы, як Пугляўскі, які выканаў план усяго на 49,2 проц., Шыбецкі—55 проц. і Веравойшанскі—57,4 проц. Гадавы план мясазагатовак выкананы на 86,6 проц.

План лесазагатовак за IV квартал выканан на будматэрыялах на 63 проц. і па дровах на 72 проц.

У сваіх дакладах тт. Міцькоў (РВК), Касцюкевіч (райсаюз) і Верабёва (прамысловасць) больш гаварылі аб дасягненнях і мала займаліся самакрытыкай. Таму зусім правільна, што ў сваіх прамовах на з'езде тав. Бенек (Наркамзем) і тав. Сосін (РК КП(б)Б) завастрылі ўвагу з'езда і ўсёй партарганізацыі на самым небяспечным зараз для Аршанскага раёна—на захапленні дасягненнямі.

Аршанскі раён мае ўсе магчымасці астацца і ў далейшым адным з перадавых раёнаў БССР і СССР. Задача партыйных, совецкіх і грамадскіх арганізацый—не захапляцца сваімі дасягненнямі, а яшчэ больш канкрэтна, з новымі сіламі ўзяцца за ажыццяўленне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Б. РОБЕРМАН.

НІЎГРУНТАВАНЫЯ НАДЗЕІ НА ВАГОН-КРАМУ

На жлобінскім чыгуначным вузле ідзе падрыхтоўка да разгорнутага гандлю хлебам. Ужо прыступілі за пабудову трох новых ларкоў і неразбсталявання хлебных аддзелаў у шасці змешаных магазінах.

Аднак, ларкі вузла не забяспечаны вагамі, не хапае 15 шт. Аб гэтым тут яшчэ не паклапаціліся.

Для падрыхтоўкі кадраў работнікаў прылаўка створаны курсы на 35 чалавек. У праграме курсаў таксама намячаецца паездка ў Менск і Гомель для азнаямлення з пастаноўкай работы лепшых хлебных магазінаў.

Заключан дагавор з хлебазаводам на поўнае забеспячэнне пошыгу чыгуначнікаў на хлеб.

Горш ідзе падрыхтоўка да гандлю хлебам на лініі жлобінскага аддзялення эксплаатацыі. Па лініі Жлобін—Калінковічы на такіх пунктах, як раз'езды Жэрдзь, Морталь, Яшчыцы і Халоднікі, дзе ёсць значная колькасць рабочых, нават і не думаюць адкрыць хлебныя ларкі.

— Мы,—гаворыць намесніх начальніка ОРС'а тав. Рэзер — будзем прадаваць хлеб праз вагон-краму.

Між тым, вагон-крама не можа штодзённа прыбываць на гэтыя пункты.

А ёсць поўная магчымасць пабудаваць у асобных пунктах ларкі і падвозіць хлеб са Жлобіна.

ГАСМАН.

А. ТАРАСАЎ
ДЫРЭКТАР БЕЛІЛЬНОТРЭСТА.

В. СУНДРАЎ
НАМ. ДЫРЭКТАРА БЕЛІЛЬНОТРЭСТА.

АБ ФАКТАХ АШУКАНСТВА ДЗЯРЖАВЫ У СЕННЕНСКІМ І ГОРАЦКІМ РАЁНАХ

26 кастрычніка сакратар Сенненскага РК КП(б)Б тав. Кац аддаў распараджэнне дырэктару Пустынскага льнозавода тав. Курсанаву: «Адпусціце калгасу «Буда» адну тону адыходаў».

25 кастрычніка загадчык Заготільна дае таму-ж тав. Курсанаву дырэктыву прыкладна таго-ж зместа: «Адпусціць для калгаса Пустынкі турбадыходаў 30 цэнт. У іх не капае 35 цэнт. валакна».

Старшыні калгаса Пальчыкі тав. Варанецкаму той-жа загадчык Заготільна дае распараджэнне: ... «Прапаную безагаворачна ўзяць з Пустынскага льнозавода дзве тоны кудзелі і пусціць іх у апрацоўку. Забяспечце безагаворачнае выкананне».

Вось тры дакументы. Колькасць іх можна было-б павялічыць, але ў гэтым няма патрэбы. І гэтыя тры дакументы наглядна гаворяць аб характары злачынства перад дзяржавай, зробленага ў Сянно.

Камісія з прадстаўнікоў Белільнотрэста ў Сянно ўставіла, што 66 калгасам раёна было раздана 76,8 тон турбінных адыходаў і поўтоны доўгага валакна. Гэта сума, устаноўленая па спісах, на самой-жа справе Сенненскі і Пустынскі заводы разбазарылі 200 тон дзяржаўнай прадукцыі.

Атрымліваючы з завода турбінныя адыходы, калгасы апрацоўвалі іх ручным спосабам, чым знижалі якасць прадукцыі і здавалі дзяржаве кудзелю нумарам 4 і 6. Выконваючы план прадукцыяй, атрымліваемай з заводаў, калгасы пакідалі пры сабе сваё доўгае валакно, пускалі яго на «мяшк» і на «ніткі» калгаснікам. У калгасе Парэчча, напрыклад, паводле слоў саміх калгаснікаў, атрымалі па 8 пудоў валакна на двор. Калгасаў, якія размеркавалі валакно паміж калгаснікамі, у Сянно не адзін дзесятак.

Так, у Сенненскім раёне ў пагоні за рекордсменствам скажаюцца на шлях «выхавання» калгасаў у духу ашуканства дзяржавы, дапамагаюць ім па два разы атрымліваць хлеб за адну і тую-ж прадукцыю. Так кіраўніцтва раёна думае ўтрымаць перадавыя пазіцыі.

Такія чынам лён адзін і той-жа два разы здаецца дзяржаве. Разбазараны турбінныя адыходы, з якіх одэскі, харкаўскі заводы вырабляюць экспартныя мяхі і іншую экспартную прадукцыю.

Высокакласнае, доўгае льнавалакно застаецца ў калгасах. Вагоны, якія адпускаліся для адпраўкі фабрыкам прадукцыі і адыходаў не выкарыстоўваліся, бо гэты лён зноў вяртаўся ў калгасы.

Такім чынам, а гэта самае галоўнае, сенненскае раённае кіраўніцтва выхоўвае ў калгаснікаў антыдзяржаўныя, безадказныя адносіны, выхоўвае настро. і імкненні абкрадваць, ашуканіць дзяржаву, з якім (настроям, імкненнямі) партыі прыходзілася і прыходзіцца весці рашучую барацьбу, выхоўваючы пачуццё большэвіцкай адказнасці за выкананне абавязковых паставак дзяржаве.

Яшчэ далей, чым сенненскае кіраўніцтва пайшлі работнікі Горацкага раёна. Упаўнаважаны камітэта загатовак т. Свірыдаў прапанаваў дырэктару льнозавода запрыходаваць 80 тон льнотрэсты загатовак 1933 года, якая знаходзілася на заводзе, у план загатовак 1934 г.

Ці варта лішні раз гаварыць аб тым, што такія дзеянні не маюць нічога агульнага з лініяй партыі, што такія дзеянні з'яўляюцца прамым вынікам прытуплення ўсякай адказнасці, страты большэвіцкага твару і скочвання на пазіцыі класавага ворага.

Урокі Сенненскага і Горацкага раёнаў павінны паслужыць сур'ёзным сігналам для дырэктароў льнозаводаў для ўсіх раёнаў. Партыя нікому ніколі не давала і не дасць права спекуляваць кроўнымі інтарэсамі пролетарскай дзяржавы.

„ЧАПАЕЎ"—НА РАЁННЫХ З'ЕЗДАХ СОВЕТАЎ

Беларяржкіно накіравала ў раёны спецыяльную кіно-брыгаду з гукавой апаратурай для дэманстравання фільма «Чапаеў», перад дэлегатамі раённых з'ездаў советаў. Апрача дэлегатаў на прагляд запрашаліся рабочыя і калгаснікі бліжэйшых прад прыемстваў і калгасаў.

З'езды советаў перадалі Беларяржкіно волгукі ў якіх выказваюць захапленне гэтым бліскучым совецкім фільмам.

У Беларусі карціну «Чапаеў» глядзелі ўжо больш 200 тыс. чалавек.

СПАТКАЦЬ НОВЫ, ТРЭЦІ ГОД ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ ПОУНЫМ ВЫКАНАННЕМ УСІХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТАУ ПЕРАД ДЗЯРЖАВАЙ

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ АД 23-XII-34 г.

Сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР па зерневой зоне камісія ЗАМАЦОУВАЕ за МЕНСКІМ раёнам (сакратар ГП тав. РЫСКІН, старшыня оргбюро РВК т. ЖАРЫН).

На чырвонай дошцы пакінуць АРШАНСКІ, ВІЦЕБСКІ і ПРАПОЙСКІ раёны, а таксама з папярэджаннем аб адставанні ў рамонце трактароў і засыпкі насенных зернавых — КАСЦЮКОВІЦКІ, у рамонце трактароў і пеньказагатоўках — СТАРОБІНСКІ, у рамонце трактароў АСІПАВІЦКІ і ЧЫРВОНА-СЛАБОДСКІ і ў пеньказагатоўках — ЛЮБАНЬСКІ раёны.

Улічваючы, што АРШАНСКІ раён (сакратар РК т. СОСКІН, старшыня РВК т. МІЦЬКОЎ) паспяхова праведзе яму сцяг ЦВК БССР, які (сцяг) знаходзіцца зараз у Барысаўскім раёне, адстаючым за апошнія месяцы ў правядзенні асноўных сельскагаспадарчых кампаній.

Камісія адзначае, што СЛУЦКІ, ЧАЧЭРСКІ і ЧЭРЫКАЎСКІ раёны, ліквідаваўшы адставанне ў пеньказагатоўках, а апошнія два і ў засыпцы насення зернавых, могуць быць занесены на чырвоную дошку.

Сцяг ЦК і СНК па ільнаводчай зоне пакінуць за СЕННЕНСКІМ раёнам. Кандыдатам на атрыманне сцяга залічыць ЧАШНІЦКІ раён. Яшчэ раз папярэдзіць кіраўніцтва гэтых раёнаў аб адставанні ў мясапастаўках, і асабліва ў засыпцы насення зернавых і рамонце трактароў.

За ганебнае адставанне ў выкананні планаў ільнозагатовак, хлебазакупак, мясапаставак і засыпкі насенных фондаў камісія пакінула на чорнай дошцы МСЦІСЛАЎСКІ, КАРМЯНСКІ, БЫХАЎСКІ, ГОРАЦКІ, ПЕТРЫКОЎСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, ЧЭРВЕНЬСКІ, ДУБРОВЕНСКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ і ЧАВУСКІ раёны.

Зняць з чорнай дошкі РЭЧЫЦКІ раён, але папярэдзіць яго аб абходнасці канчаткова ліквідаваць адставанне ў хлебазакупках.

Кандыдатамі на чорную дошку пакінуць ГАРАДОЦКІ і БЯРЭЗІНСКІ раёны.

Дадаткова за абсалютна незадавальняючыя тэмпы хлебазакупак залічыць кандыдатамі на чорную дошку КАМАРЫНСКІ, СУРАЖСКІ і ШКЛОЎСКІ раёны.

Зняць з кандыдатаў на чорную дошку ЖЛОБІНСКІ і БАБРУЙСКІ раёны, папярэдзіўшы іх аб необходнасці яшчэ больш узмацніць тэмпы хлебазакупак.

Камісія катэгарычна папярэджвае кіраўніцтва КЛІМАВІЦКАГА, ХОЙНІЦКАГА, РАГАЧОЎСКАГА і РАСОНСКАГА раёнаў аб ліквідацыі адставання ў ільнозагатоўках, а УВАРАВІЦКАГА, УШАЦКАГА, ЛОЕЎСКАГА і ПЛЕШЧАНІЦКАГА — у хлебазакупках. У выпадку працягвання адставання гэтых раёнаў яны будуць залічаны кандыдатамі на чорную дошку.

*) Па тэхнічных прычынах пастанова камісіі друкуецца со спазненнем.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Пастановай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносяцца на чырвоную дошку:

МЕНСКІ раён (сакратар ГК Рыскін, старшыня оргбюро РВК Жарын);

АГІШАНСКІ раён (сакратар РК Соскін, старшыня РВК Міцькоў);

СЕННЕНСКІ раён (сакратар РК Кац, старшыня РВК Качук);

ЛЮБАНЬСКІ раён (сакратар РК Кардаш, старшыня РВК Клімаў);

СТАРОБІНСКІ раён (сакратар РК Баярчанка, старшыня РВК Махнач);

АСІПАВІЦКІ раён (сакратар РК Фельдман, старшыня РВК Караленка);

ВІЦЕБСКІ раён (сакратар ГК Жураўлёў, старшыня горсовета Аверын);

КАСЦЮКОВІЦКІ раён (сакратар РК Лісковіч, старшыня РВК Грэбеньчык);

ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ раён (сакратар РК Бурдзілаў, старшыня РВК Дыгун);

ЧАШНІЦКІ раён (сакратар РК Марголін, старшыня РВК Трызна).

ПРАПОЙСКІ раён (сакратар РК Кавалёў, старшыня РВК Чорнабродаў).

Чорная дошка

За зрыў планаў перапрацоўкі і здачы ільнопрадукцыі і іншых паставак дзяржаве заносяцца на чорную дошку:

МСЦІСЛАЎСКІ раён (сакратар РК Штайнгарт, старшыня РВК Рай);

КАРМЯНСКІ раён (сакратар РК Салядухін, старшыня РВК Грыбаедаў);

БЫХАЎСКІ раён (сакратар РК Рэзнікаў, старшыня РВК Грынкевіч);

ГОРАЦКІ раён (сакратар РК Вільчак, старшыня РВК Жук);

ПЕТРЫКОЎСКІ раён (сакратар РК Арашчук, старшыня РВК Град;

ЛЕЛЬЧЫЦКІ раён (сакратар РК Асінскі, старшыня РВК Гаўрусеў);

ЧЭРВЕНЬСКІ раён (сакратар РК Васільева),

ДУБРОВЕНСКІ раён (сакратар РК Мышалаў, старшыня РВК Мацко);

ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ раён (сакратар РК Лапацін, старшыня РВК Дупанаў);

ЧАВУСКІ раён (сакратар РК Кулікаў)

ЧАМУ У МСЦІСЛАЎЛІ ЗРЫВАЮЦЬ ІЛЬНОЗАГАТОЎКІ

У той час як многія раёны Беларусі выканалі план ільнопрадазагатовак, а рад раёнаў зараз завяршаюць гэта важнейшае дзяржаўнае заданне, Мсціслаўшчына ганебна цягнецца ў хвосце, ганьбіць усю БССР.

Пабыўшы ў некалькіх калгасах, менская буксірная брыгада ўпэўнілася, што асноўная прычына адставання раёна гэта кулацкі сабатаж ільнозагатовак у розных сельсоветах і калгасах. У большасці калгасаў пануюць антыільняныя настроі. Кулацкая работа і агітацыя супроць загатовак льну тут разгорнута больш, чым работа раённага кіраўніцтва па выкананню абавязацельстваў перад дзяржавай.

Кулак агітуе: план не выканаем — знатыць у будучым годзе план пасеву ільну зменшаць.

Пачынаючы ад раёна і канчаючы калгасам, усе заклікаюць, што лён не ўрадзіў і план выканаць быць не можа.

У сапраўднасці лён у Мсціслаўшчыне ўрадзіў добры. Лён у раёне быў і зараз ёсць. І план можна было-б выканаць. Але большэвіцкая барацьба за лён адсутнічае. Гора-кіраўнікі раёна змагаюцца за лён у кабінетах, не ведаюць што робіцца ў калгасах.

У калгасах-жа, якія злачынна не выконваюць плян, лён разбазарылі, раскралі; мсціслаўскі лён вывозіцца нават за межы БССР.

У вёсцы Добрае (калгас «12-годдзе») у калгасным знаходзіцца па некалькі пудоў ільну. У Забалацкім сельсавеце да прыезду брыгады з Менска ні ў адным калгасе не была налажана перапрацоўка льну. Лён гніў і псаваўся ў кожным калгасе. Кулацкаму сабатажу, распусканню, антыкалгаснаму настроям ніхто не даваў адпору. Под мухамі-сабатажнікамі ён зрабілася нікаднага паказальнага калгаса. Кіраўніцтва раёна — РК, РВК і палітаддзелы (а іх два ў раёне), зусім не адчуваюцца ў калгасах. Значная частка калгасаў засмечана класава-варожымі элементамі. У калгасе «Шлях сацыялізма» сын попа Картаў вучыць попа новае пакаленне. У калгасе «12-годдзе Кастрычніка» знайшла сабе прытулак бандыты. Старшыня калгаса «Ударнік» Атрашкевіч Ігнась, былы кулак, меў 30 га зямлі. Старшыня рэвізійнай камісіі калгаса «Асаавіяхім» таксама былы кулак. Такіх прыкладаў можна прывесці багата. Усё гэта кулацкае ахвосце безпакарана праводзіць сваю шкодніцкую работу пад носам у раённага кіраўніцтва.

Усё кіраўніцтва — гэта балбатуны, якія на словах абяцаюць нешта чаго рабіць, але вялі не пастаўць, на мінуту адвернуцца, ні за што абяцанага не выконваюць.

Аб агіпасевах у Мсціслаўскім раёне можна пісаць без канца, але і з вышэйпаказанага можна зрабіць такі вывад:

Мсціслаўскі раён мае ўсе магчымасці каб выконваць усе мерапрыемствы партыі, калі кіраўніцтва раёна рашуча зменіць сваю лінію ў ільнозагатоўках.

Член менскай букінрнай брыгады, старшыня калгаса імя ДЗЮ НАРНЕЙЧЫК.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Пастановай камісіі па спаборніцтву з Заходняй вобласцю заносяцца на чырвоную дошку:

МЕНСКІ раён (сакратар ГК Рыскін, старшыня оргбюро РВК Жарын);

АГІШАНСКІ раён (сакратар РК Соскін, старшыня РВК Міцькоў);

СЕННЕНСКІ раён (сакратар РК Кац, старшыня РВК Качук);

ЛЮБАНЬСКІ раён (сакратар РК Кардаш, старшыня РВК Клімаў);

СТАРОБІНСКІ раён (сакратар РК Баярчанка, старшыня РВК Махнач);

АСІПАВІЦКІ раён (сакратар РК Фельдман, старшыня РВК Караленка);

ВІЦЕБСКІ раён (сакратар ГК Жураўлёў, старшыня горсовета Аверын);

КАСЦЮКОВІЦКІ раён (сакратар РК Лісковіч, старшыня РВК Грэбеньчык);

ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ раён (сакратар РК Бурдзілаў, старшыня РВК Дыгун);

ЧАШНІЦКІ раён (сакратар РК Марголін, старшыня РВК Трызна).

ПРАПОЙСКІ раён (сакратар РК Кавалёў, старшыня РВК Чорнабродаў).

ТЕОРЫ ЛЕНІНА І СТАЛІНА—У ХАЛОПЕНІЧАХ ПАД ЗАБАРОНАЙ

У загадчыцы халопеніцкай хаты-чытальні Гурэвіч — дачкі спекулянта — шкоднасць брашур Леніна, Сталіна, Молатава, Кагановіча для калгаснага чытача не выклікала ніякіх сумненняў. І сапраўды, не можа-ж дачка спекулянта распаўсюджваць артыкулы тав. Сталіна аб калектывізацыі, раскулачванні і т. д. Не можа-ж яна прапагандаваць генеральную лінію партыі, у працэсе ажыццяўлення якой выкарчоўваюцца астаткі капіталізма ў нашай краіне.

І дачка спекулянта Гурэвіча — загадчыца хаты-чытальні — зрабіла тое, што ёй падказвала не ўласнае сумненне. Яна вычысціла з бібліятэкі наступныя кнігі:

Ленін — «Организационные основы партии» выд 1926 г.

Ленін — «Задачи комсомола», выд 1930 г.

Ленін — «О кооперации», выд. 1929 г.

Ленін — «Детская болезнь левизны в коммунизме».

Ленін — «Речи на конгрессах Коминтерна».

Ленін — «Уроки московского восстания Маркс и Плеханов о восстании».

Ленін — «Война войне».

Сталін — «Вопросы ленинизма».

Сталін — «К вопросам аграрной политики в СССР» (прамова на канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў).

Сталін — «Год вялікага пералому» (6 кніжак)

Каганович — «Партия и советы».

Молатаў — «Об успехах и трудностях соц. строительства»

Акрамя таго Гурэвіч вычысціла з бібліятэкі кнігі Максіма Горкага, Бруно Ясенскага і рад іншых.

Нельга сказаць, што Гурэвіч зрабіла гэту контрэвалюцыйную чыстку бібліятэкі ад партыйнай літаратуры выключна на свой страх і рызыку. Па гэты шкодніцкі акт яна атрымала санкцыю члена партыі Турука, які ў той час быў выкладчыкам грамадазнаўства ў Халопеніцкай школе, а зараз вучыцца ў Вышэйшым педагагічным інстытуце ў Менску.

Ужо з пачатку як халопеніцкай хатай-чытальняй загадвае нейкі грамадзянін Шуб, які перад гэтым скончыў настаўніцкія курсы. І вось ужо катры месяц Шуб журыцца падыходзіць да зачыненай шафы з забароненай літаратурай і ўсё баіцца яе адамкнуць.

— Не веладаю як быць, — скардзіцца Шуб. Як-ні-як, а гэта чыстка была санкцыянавана членам партыі, і не якім-небудзь радавым калгаснікам, а грамадазнаўцам. Ён-жа сам навучаны ў школе вы-кладаў. Кому, як не яму, карты ў рукі.

Праўда, для сваіх сумненняў Шуб мае і больш сур'ёзныя падставы. Выманне марксісцкай літаратуры з бібліятэкі было ў раённым цэнтры санкцыянавана не адным толькі членам партыі, а цэлай камісіяй, вылучанай райкомам партыі. Гэта ўжо больш сур'ёзная матывіроўка.

Улетку гэтага года крупская раённая газета падняла пытанне аб засмечанасці раённай бібліятэкі. Была вылучана камісія ў складзе загадчыка райліта, дырэктара школы, члена партыі тав. Кобля і камсамольца, дырэктара яўрэйскай школы тав. Думмана. Літаратуру, якую, па іх думцы, бясспрэчна трэба было забраць з бібліятэкі, яны запісалі ў спецыяльны спіс, а вялікую колькасць кніг жак яны пакінулі пад сумненнем, удаліўшы іх тымчасам з бібліятэкі. Сярод гэтых «сумніцельных» кніжак аказалася наступная літаратура:

Зборнік «Шляхі калгаснага будаўніцтва», выданне 1930 г., у якім 6 артыкулаў тав. Сталіна.

Ленін — «Еще раз о профсоюзах, текущем моменте и об ошибках тт. Троцкого и Бухарина», выданне 1921 г.

М. Пакроўскі — «1905 год», выд. 1931 г.

М. Пакроўскі — «Русская история в самом сжатом очерке», выд. 1931 г.

М. Пакроўскі — «Теория пролетарской революции», выд. 1930 г.

Бацаў — «Большевики в государственная дума».

Тімірязеў — «Основные черты истории развития биологии в XIX веке».

У ліку уратых пад сумненне трапілі кнігі аб рэвалюцыі 1848 г., аб развіцці земнага шара, нарысы па гісторыі сацыялізма і інш.

Пяць месяцаў патрабавалася камісіі, каб разабрацца, ці патрэбна гэта літаратура для чытачоў, ці не. Грамадзянін Шуб у Халопеніцах усё чакае вырашэння гэтага сумнення ў раёне.

— Як вырашаць раённыя арганізацыі зрабіць са сваімі кнігамі, так я са сваімі зраблю. Не магу-ж я на сваю адказнасць даць Леніна і Сталіна калгаснікам чытаць. Нехай замок на шафе яшчэ пазвісіць.

***

Вось так клясава-варожыя элементы вызарыстоўваюць калгаснае дабрабыт нашай клясавай пільнасці для таго, каб тварыць свае контрэвалюцыйныя справы, выкарыстоўваючы для гэтага і асобных перарадзіцеляў — членаў партыі.

І. КАЗЛОЎ.

Не працягу апошняга года «Звязда» некалькі раз завастрала ўвагу раённых партыйных арганізацый і органаў народнай асветы, што антысовецкія элементы вынідваюць з бібліятэк клясікаў марксізма-ленінізма, што асобныя нацдэмаўскія элементы ўтойваюць ад нашых чытачоў мастацкія творы рускіх пролетарскіх пісьменнікаў. Так было ў ДРЫСЕ, ШКЛОВЕ, ВЕТЦЫ, і ў радзе іншых раёнаў БССР.

Аднак, работнікі КРУПСКАГА раёна прайшлі міма гэтых сігналаў. Страціўшы рэвалюцыйную пільнасць кіраўнікі асветы ў Крупскім раёне дагэтуль магчымасць класава-варожым элементам із'яць з халопеніцкай і крупскай бібліятэк творы ЛЕНІНА, СТАЛІНА, МОЛАТАВА, ГОРКАГА і іншых.

Рэдакцыя чакае ад Крупскага райкома і Наркамасветы тэрміновага паведамлення, што імі канкрэтна зроблена для прывядзення ў парадак бібліятэк у Халопенічах і Крупках і пакарання вінаватых у гэтых антысовецкіх выпадках.

Ад Наркамасветы «Звязда» чакае рашучых мер па вычышчэнню кадраў зат. бібліятэк ад клясава-чужых элементаў і наладжвання штодзённага кантроля работы бібліятэк.

ПІСЬМЫ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ

САКРАТАРУ ЦСПСБ тав. ГЕРАЎКЕРУ.

КАЛІ-Ж НАША „СТАЛОВАЯ" БУДЗЕ СТАЛОВАЙ

(Пісьмо рабочых друкарні імя СТАЛІНА)

Наша сталовая не з'яўляецца ўдарным цэхам вытворчасці. Гэта — самае вузкае месца на нашым прадпрыемстве.

За апошні час змянілася чатыры запчыкі, а справы ў сталоўцы не толькі не палепшаюцца, але пагаршаюцца.

Абеды вельмі дрэнныя. Блюды адностайныя. Калі гатуюць, напрыклад, суп з крупы, дык абавязкова і другое блюда з той-жа крупы. У меню пішуць адно, а прадаюць другое блюда. У меню запісан напрыклад, «гарбэ з бульбы», а на справе гэта гарохавая або кукурузная каша. 10 снежня ў меню пісалася «чырвоны боршч», а давалі боршч з кармовых буракоў без усякага смаку.

Калі рабочы кантроль і ўрач запісалі ў бракеражную кнігу прапанову, каб не гатавалі больш боршч з кармовых буракоў, дык старшыня ЗРК т. Рубінштэйн раскрычаўся: «Што мне рабочы кантроль! Даем такія прадукты, якія маем».

У сталовай антысанітарыя. Абедаючым падаюць брудныя лыжкі і відэлкі.

Трыкутнік друкарні і адміністрацыя сталовай не цікавяцца палепшэннем яе работы.

Аб нашай сталовай ужо пішуць пісалі ў насцепгазетах, пішуць-тыражцы, у газеце «Рабочий». Але ўсё застаецца па-старому.

Рабочыя: Нічаеў, Каплан, Марковіч, Баркер, (усяго 10 подпісаў).

АРШАНСКАМУ РАЙПРАКУРОРУ тав. ФІШМАНУ

КАЛІ Я АТРЫМАЮ СВАІХ АВЕЧАК

(Пісьмо дэмабілізаванага чырвонаармейца)

Перад уходам у Чырвоную армію, пакольку ў мяне няма ні бацькоў, ні сваякоў, я здаў двух авечак і ягнят на пашу гр. Баркоўскаму з вёскі Ліпінск (Аршанскі раён).

Праз некаторы час за ніпылату штрафу забралі ў Баркоўскага як яго авечак, так і маіх.

Вярнуўшыся з Чырвонай арміі, я патрабаваў, каб Баркоўскі вярнуў мне маіх авечак. Аказалася, што сельсавет не выдае іх, таму што яны не ўзяты на ўлік, а ў часе ўліку жывёлы я быў у арміі.

Некалькі раз я звяртаўся ў Леднявіцкі сельсавет, але атрымліваў адзін адказ: «Авечак вы не атрымаеце».

Скардзіўся я райпракурору тав. Фішману, аднак ён ніякіх мер не прыняў.

БУРАКОЎ.

АД РЭДАКЦЫІ.

«Звязда» лічыць, што Леднявіцкі сельсавет паступае незаконна, затрымліваючы выдачу тав. Буракова. Буракоў не можа носіць адзенкаю ці за тое, што яго авечкі не былі ўзяты на ўлік, пакольку ў часе ўліку ён служыў у радах Чырвонай арміі.

«Звязда» чакае, што раённы прачыкор тэрміново разгледзе гэту справу і прымусіць Леднявіцкі сельсавет захоўваць рэвалюцыйную законнасць.

САКРАТАРУ МАЗЫРСКАГА РК КП(б)Б тав. ШЫМКОВІЧУ

ЗА ШТО МЯНЕ ВЫКЛЮЧЫЛІ З КАЛГАСА

(Пісьмо селяніна)

Мне 55 год, жыву я ў вёсцы Замошчаны, Хаміцкага сельсавета Мазырскага раёна. Увесь час меў 3,5 га зямлі, адну карову, аднаго каня. Мой старэйшы сын Ігнат адзяліўся ў 1925 г., зараз з'яўляецца старшынёй калгаса «Рухавік рэвалюцыі». Малодшы сын Мікола жыве са мною. З 1928 г. ён увесь час працуе ў сельсавеце.

Я ў 1933 г. уступіў у калгас з сваёй жонкай. Працаваў па-ўдарнаму, перавыконваў нормы. Быў прэміраваны.

Але хутка адносіны да мяне змяніліся. Кулак Латышкевіч, каб адпомсціць за работу маіх сыноў, заявіў, што я займаўся шкодніцтвам, дрэнна абмалаціў каноплі. І мяне без усякіх падстаў выключылі з калгаса.

Наркамзем Беларусі адзавіў мяне ў правах калгасніка, сказаўшы пастанову праўлення.

Але старшыня сельсавета Кавалевіч не дапускае мяне да работы.

Д. СКАЧКОЎ.

Па слядах неапублікаваных пісем

Сялькор М. Камароўскі пісаў у рэдакцыю аб тым, што старшыня Фанцпольскага сельсавета (Дзяржынскі раён) Вейцехоўскі (член партыі) сістэматычна п'янствуе з крамнікам Кезлоўскім, настаўнікам Паўловічам. Вейцехоўскі незаконна атрымліваў у калгасе імя Пакроўскага ячмень, жыта, мясо, сала і т. д.

У калгасе было засеяна каля 10 га ільнабраніцкім жытам, але Вейцехоўскі гэта ўкрыў.

Дзяржынскі РК КП(б)Б паведамляе, што Вейцехоўскі з работы старшыні сельсавета знят. Адначасова справа аб указаных дзеяннях высвятляецца і пытанне аб яго партыйнасці будзе разгледжана дадаткова.

САКРАТАРУ КЛІЧАЎСКАГА РК КП(б)Б тав. ЦІШКЕВІЧУ

ШКОЛЫ АСТАЮЦЦА БЕЗ ГАЗЫ

(Пісьмо настаўніка)

За ўвесь час з 1 верасня г. г. школы малапісьменных і непісьменных Ганчанскага сельсавета (Кліцаўскі раён) атрымалі толькі па 2 літры газы.

Настаўнікі не могуць праверыць сшыткі, падрыхтавацца да лекцый, нельга весці нармальна заняткі ў школах.

У наказ новаму складу сельсавета быў унесен пункт аб паляпшэнні работы селыю, у прыватнасці, аб снабжэнні школ і насельніцтва газай. Але ніхто не збіраецца выканаць гэты пункт.

Старшыня сельсавета Заяц спасылаецца на «аб'ектыўныя» прычыны. «Няма падвод, няма тары». Нашэўна «аб'ектыўнымі» прычынамі растлумачыць ён і растрату за тры месяцы 8 тысяч руб. казапераціўных грошай.

В. АСТРОЎСКІ.

Па слядах выступленняў „Звязды"

„НЕ ПАКІДАЦЬ БЕСПАКАРАНЫМІ ВІНАВАТЫХ У АБАРТАВАННІ КАБЫЛ"

Як паведамляе кіраўніцтва конегадоўлі Наркамзема, па матэрыялах агляду пісем аб фактах абартавання кабыл («Звязда» за 15 снежня), 24 снежня будзе праведзен паказальны судовы працэс над вінаватымі ў Слуцку.

***

Пракуратура рэспублікі даручыла Полацкаму, Старобінскаму, Буда-Кашалёўскаму і Пухавіцкаму райпракурорам правесці следства і аддаць пад суд вінаватых у абартаванні кабыл па фактах, якія апісаны ў агляде пісем («Звязда» за 15 снежня).

„КУЛАЦКІЯ АГЕНТЫ ВЫКЛЮЧЫЛІ АКТЫЎНАГА ЧЛЕНА СЕЛЬСОВЕТА З КАЛГАСА"

Пракурор Чэрыкаўскага раёна паведамляе рэдакцыі, што член сельсавета Папякова адноўлена ў правах члена калгаса «Победа», а старшыня калгаса Кавярын і брыгадзіры Барысаў і Кіраньковы аддадзены пад суд.

„ДРАПЕЖНІКІ НЕ ПАК'РАНЫ"

Правесці следства і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у драпежніцкіх адносінах да калгасных коней даручыла пракуратура рэспублікі Кліцаўскаму райпракурору па пісьму тав Астроўскага, змешчанаму ў «Звяздзе» 20 снежня.

„У ШКЛОВЕ ПРЫ ПАПУСЦІЦЕЛЬСТВЕ РАЙКОМА І РВК СЕЛЬКОРАЎ ВЫКЛЮЧАЮЦЬ З КАЛГАСАЎ"

За зайгы самазрытыкі і пераследаванне сялькора Сікорына, па матэрыялах «Звязды» ад 3 верасня асуджаны былы старшыня калгаса імя Калініна, Шклоўскага раёна Кісялёў — да 4 год пазбаўлення волі ў аддалёных мясцовасцях СССР з канфіскацыяй пасля адбыцця пакарання на працягу двух год займаць адказныя кіруючыя пасады і старшыня Ардацкага сельсавета, Шклоўскага раёна Алексеў — да аднаго года прымусовых работ у калоніі мясцовых работ.

ПАРТКОМЫ НАРКАМАТАЎ НЕ ЗМАГАЮЦЦА ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ РАШЭННЯ ЦК АБ РЭГАВАННІ НА ПІСЬМЫ ПРАЦОЎНЫХ

20 лістапада г. г. у «Звяздзе» апублікавана рашэнне ЦК КП(б)Б пра станоўчага рэгавання на пісьмы і скаргі працоўных у радзе наркаматаў і раёнаў.

Гутарка ішла аб Нарнамеце, аховы здароўя, Наркомасветы, Нарнамеце костыляў, упоўнаважаным Нарнамата сувязі, ЦСПСБ, аб Магілёўскім, Аршанскім, Полацкім, Чэрвеньскім, Чавускім, Капыльскім, Дзяржынскім раёнах і Менгорадзе.

У пастанове ЦК было сказана: «Гэты ФАКТ (нерэгаванне на пісьмы, РЭД.) СВЕДЧЫЦЬ АБ НЕРАЗУМЕННІ КІРАЎНІКАМІ УКАЗАНЫХ НАРКАМАТАЎ І РАЁНАЎ, ЯК ПАВІННЫ БОЛЬШЭВІКІ АДНОСІЦЦА ДА ПІСЕМ І СКАРГ ПРАЦОЎНЫХ». Такая ацэнка абавязвала ўсіх кіраўнікі ў установе і раёнаў рашуча змяніць існуючае становішча з рэгаваннем на пісьмы.

Для гэтага патрэбна было, паводле шэф, дэтальна распрацаваць пастанову ЦК у партарганізацыі, сярод беспартыйных рабочых і служачых; па-другое, увяжліва праверыць усю сістэму пастаноўкі рэгавання і на аснове гэтага вызначыць цэлы рад мерапрыемстваў (выдзяленне адказных асоб, наладжванне праверкі выканання, уліку і т. д.) для наладжання пастаноўкі рэгавання.

Мы праверылі, як рэалізуюцца пастановы ЦК у НАРКАМАЦЕ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ, НАРКОМАСВЕТЫ, ЦСПСБ і НАРКАМЗЕМЕ.

Рэзультаты праверкі паказваюць, што ў гэтых арганізацыях ЯШЧЭ НЕ ЗРАЗУМЕЛІ ПАЛІТЫЧНАЙ ВАЖНАСЦІ ГЭТАЙ ПАСТАНОВЫ І НЕ ЎЗЯЛІСЯ ЗА ЯЕ КАНКРЭТНАЕ ПРАВЯДЗЕННЕ Ў ЖЫЦЦЕ. ДА ГЭТАГА ЧАСУ РАШЭННЕ ЦК НАВАТ НЕ ПРАПРАЦАВАНА НІ Ў ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ ГЭТЫХ НАРКАМАТАЎ, НІ СЯРОД СЛУЖАЧЫХ.

У апраўданне гэтага сакратар парткома Наркомаховы здароўя тав. ПАРХОМЕНКА выстаўляе такі аргумент, як частыя раз'езды членаў парткома ў камандзіроўкі і тое, што ён зусім нядаўна стаў сакратаром. Тав. Пархоменка не мог назваць назваць сектара, у якім горш за ўсё паступала справа рэгавання. Другі член парткома, тав. Бельскі, на наша запытанне, ці прапрацавана пастанова ЦК на пасяджэнні парткома па здзяўленнем заявіў: «Мы ад ЦК ніякіх дырэктыў не атрымліваем, нам кіруе непасрэдна горкам».

Сакратар парткома Наркомасветы тав. ДАВІДОВІЧ заявіў: як абстаіць справа з рэгаваннем у Наркомасветы, не скажу, не прачытаў. Пастанову ЦК не прапрацоўвалі сярод комуністаў і сярод служачых наркамата».

А тав. Клябанаў—сакратар парткома ЦСПСБ — сустрэў нас з заявай: «О у нас справа пастаўлена добра. Мы кожную заметку абгаварваем на пасяджэнні парткома, і на кожную хутка і па-большэвіцку рэагуем». Сапраўды, партком разглядаў цэлы рад заметак, змешчаных у шматтыражцы ЦСПСБ. Пытаннем-жа пастаноўкі рэгавання ў апараце ЦСПСБ на пісьмы і скаргі працоўных, паступаючыя непасрэдна ў ЦСПСБ і яго сектары, не займаўся.

Заходзім у кіраўніцтва справай ЦСПСБ просім паказаць рашэнне прэзідыума. «Зайдзіце да сакратара прэзідыума тав. Кацовіча»,— сказалі нам. Пашлі. І, к нашаму здзіўленню, аказалася, што ніякай пастановы няма.

У пачатку лістапада кампанская група ЦСПСБ выявіла мясавы залем заяў у пенсіённым стале ЦСПСБ. Тут заявы аб устанаўленні пенсіі, аб выплаце пенсіі мясцовымі ашчадкасамі праляжвалі па 3-4 месяцы без ніякага руху. Матэрыял быў перададзен намесніку сакратара парткома тав. Рубінштэйну. Але той разгаварваў на яго тым, што пагаварыў з сакратаром ЦСПСБ тав. Герайкерам. Абгаварыць-жа матэрыялы комсамольцаў, якараць вінаватых Рубінштэйн не палічыў патрэбным.

Наркамзем БССР хоць не фігуруе ў пастанове ЦК, але таксама можа быць аднесен да ліку тых арганізацый, дзе справа рэгавання на пісьмы і скаргі працоўных паставлена зусім дрэнна. Не гледзячы на гэта, і тут пастанова ЦК не знайшла належнага рэгавання. Як таксама, як і ў рэшце названых наркаматах, нават не абмяркоўвалі на пасяджэнні парткома і на сходзе работнікаў апарата. Сакратар парткома тав. Мітніцкі шчыра прызнаецца: НЕДААЦАНІЎ Я ЯЕ, НЕ НАДАЎ ЕЙ НАЛЕЖНАГА ЗНАЧЭННЯ; А ЯК У НАС ПАСТАЎЛЕНА СПРАВА РЭАГАВАННЯ Ў НАРКАМЗЕМЕ, Я НАВАТ І НЕ УЯЎЛЯЮ САБЕ.

Сказанае як нельга лепш пацвярджае праўдзівасць таго месца ў пастанове ЦК, дзе сказана: «КІРАЎНІКІ УКАЗАНЫХ НАРКАМАТАЎ І РАЁНАЎ НЕ ЗРАЗУМЕЛІ НЕАДНАРАЗОВЫХ УКАЗАННЯЎ ТТ. СТАЛІНА І КАГАНОВІЧА АБ ЧУЛЫХ АДНОСІНАХ ДА КАНКРЭТНЫХ ПАТРЭБ КОЖНАГА ПРАЦОЎНАГА». З гэтага ясна, чаму кіраўнікі гэтых наркаматаў і кіраўнікі партыйных арганізацый гэта пагардзілі адносіцца да пастановы ЦК якая абавязвала іх прыняць усе захады да таго, каб справа рэгавання на пісьмы і скаргі працоўных была пастаўлена ўрэшце.

АНІШЧУК, КАГАН, Д.

За рубяжом

Да кадыходзячага плебісциту ў Саары.
На здымку: у парадку падрыхтоўкі да плебісциту ў Саары камісія правярае тэхніку галасавання.

ПАРЫЖСКІ ДРУК АБ СТАНОВІШЧЫ У БЕРЛІНЕ

МІЖУСОБНАЯ БАРАЦЬБА У КІРУЮЧАЙ ВЕРХАВІРЦЫ

ПАРЫЖ, 24 снежня. (Інфармацыя «Правды»). Што адбываецца ў Германіі? Гэта пытанне задае ўвесь французкі друк, натаміначы аб таямнічым акружэнні ўночы з 20-21 снежня будынка, у якім размяшчана міністэрства рейхсвера (армії).

Нават «Матэн», які прыязна адносіцца да германскіх, нацыянал-сацыялістаў, падкрэслівае ў карэспандэнцыі з Берліна неспакой, які панае ў германскіх палітычных колах.

Закранаючы саарскае галасаванне і матчымы эварот Саара Германіі, газета піша:

«Многія немцы чакаюць 15 студзеня (дзень галасавання ў Саары) з неспакоем. Яны думаюць, што Гітлер адкладзе да скончэння саарскага галасавання рад важных рашэнняў, датычных барацьбы з аб'ядкаўшымися пратэстантамі, якія выступаюць супроць афіцыяльнай царквы, рэарганізацыі ахоўных аддзелаў у мэтах іх аслаблення і інш. Шматлікія арышты, якія праводзяцца ў Берліне, зусім не спрыяюць супакаенню насельніцтва.

Учарашні нумар парыжскай газеты «Журналь», апублікаваўшай паведамленне аб выключных мерах, прынятых уночы з 20 на 21, быў канфіскаваны ў Германіі палітычнай паліцыяй.

Карэспандэнт «Матэн» падкрэслівае паведамленне аб масавых арыштах нацыянал-сацыялістаў у Германіі. Думаюць, што за апошні час затрымана ня 8 тысяч чалавек. Арышты звязаны з нейкім таямнічым дакументам. Думаюць, што справа ідзе аб завяшчанні Эрнста, выкрытым падпальшчыкам рейхстага.

У «Фігаро» надрукаваў артыкул Владзімір Ормесон аб разгаласях паміж рейхсверам і Гітлерам. Ормесон піша: «Адно ясна—германскі кацёл кіпіць. Не гледзячы на чыстку, праведзеную 30 чэрвеня, інтрыгі прадаўжаюцца з ранейшай агрэтай, і паміж паасобнымі клікамі (групамі) адбываецца міжусобная барацьба. З дня ў дзень ліквідуюць без шуму падобных сведак. Пры гэтым прымушаюць маўчаць, але якой цаной, бо падыходзіць 15 студзеня, і да гэтага дня трэба ўнікаць усякага шуму».

Ормесон мяркуе, што пасля саарскага галасавання наступіць развязка ўнутранага крызіса, якім зараз захоплена Германія. «Праз—незвыкі тыдзень,—піша Ормесон,—мы зможам наглядаць ліквідацыю нацыянал-сацыялізма. Інакш кажучы, настаўляцца рейхсвер і ўсё, што да яго ўмяшчецца».

На думку «Фігаро», нацыянал-сацыялізм натыкаецца на надзвычай моцнае супраціўленне не толькі ў радах рейхсвера. Паводле слоў газеты, «кіраўнікі арганізацыі «сталёвы шлем» спрадвеку лічаць, што эра ўмяшання, якую прыпісвае пераможць да 30 чэрвеня, ужо прайшла, што шмат члены і арганізацыі могуць зноў вольна хадзіць з высока паднятай галавой, імкнучыся да сваёй ахоўнай мэты, г. зн. да аднаўлення монархіі».

ЗБЯДНЕННЕ ПРАЦОЎНЫХ МАС У ПОЛЬШЧЫ

ЖЫВУЦЬ ВА УМОВАХ, ЯКІЯ НЕЛЬГА НАЗВАЦЬ УМОВАМІ ЧАЛАВЕЧАГА ІСНАВАННЯ

ВАРШАВА, 23 снежня (БЕЛТА). Катавіцкая газета «Полонія» змяшчае перадавы артыкул аб зарушэннях, якія перажывае Польшча. «Некалькі мільёнаў людзей у вёсцы,—указвае газета,—знаходзяцца ва ўмовах, якія толькі з натяжкай можна назваць умовамі чалавечага існавання. Мы знаходзім выхад перш за ўсё ў спяжвані поўнага патужэй, у развіцці-ж нашых прыродных багаццяў мы не прасоўваемся наперад. Больш таго, у нас няма нават пікай адносна гэтага праграмы. На пустых жыватах цяжка будаваць вялікую дзяржаву».

Газета прыводзіць данныя аб сытуацыі перавозках, з якіх відаць рэзкае падзенне гаспадарчага жыцця ў краіне. «Полонія» прыводзіць таксама факты, якія гавораць аб збяднінні мас, аб тым, што «нацыянальны даход, які прыпадае на адну душу насельніцтва Польшчы, з'яўляецца адным з найбольш нізкіх у Еўропе. Пазбаўленыя сродкаў да жыцця, велізарныя масы насельніцтва Польшчы эміграцюць у другія краіны. З 1926 па 1930 год уключна з Польшчы эміграваала 964 тыс. чал. На 32 мільёны насельніцтва налічваецца 6 мільёнаў зусім неграмотных, прычым, у адной толькі Варшаве жыве 200 тыс. чал., якія не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць. Адзін мільён дзяцей у школьным узросце школі не пападуць у школы.

Адзіны фронт прапоўных фізкультурнікаў

ПАРЫЖ, 24 снежня. (БЕЛТА). Адбыўся аб'яднаны з'езд рэвалюцыйнай спартыўнай федэрацыі краіны і рафармісцкай спартыўнай арганізацыі. На з'ездзе — 800 делегатаў, якія прадстаўляюць 30 тыс. пролетарскіх фізкультурнікаў. Устанаўлем і сведам «Інтэрнацыянала» з'езд супраць делегацыю чырвонага Спортінтэрна. З'езд віталі прадстаўнікі компартыі, унітарных профсаюзаў, сацыялістычнай партыі, усеагульнай канфедэрацыі працы і пролетарскай спартыўнай федэрацыі Чэхаславакіі. Сакратар компартыі Дакло вітаў стварэнне адзінага фронту працоўных фізкультурнікаў, як запуку адзінства ўсяго рабочага класа. Пасля прамоў прадстаўнікоў чырвонага Спортінтэрна делегаты спелі «Інтэрнацыянал».

КРУШЭННЕ НА КУЧ

ШАНХАЙ, 24 снежня. (БЕЛТА). Паводле вестак з Харбіна, 22 снежня на перагоне Імяньпо—Вейшахе (Уходняя лінія КУЧ) на 1.118 кілометры папярэдняе крушэнне таварны поезд № 52, гружаны вугальнымі бобамі. Поезд абгрэльваўся на працягу 10 мінут. Пасля абстрэлу недалічыліся знячкаў Сапаво, грамадзяніна СССР і Ян Юнчун, а таксама старшага кандуктара Вакуленко — грамадзяніна СССР.

Высветлілася, што на 1.118 кілометры быў разобран путь, а прагны чаго паравоз і тры вагоны выйшлі з рэек. Паравоз і вагоны пашкоджаны.

У СОВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР

АБ ПЕРААЦЭНЦЫ АСТАТКАЎ ТАВАРАЎ НА ПЕРШАЕ СТУДЗЕНЯ 1935 г. У СУВЯЗІ СА ЗМЕНАЙ ЦЭН НА ХЛЕБ І НЕКАТОРЫЯ ІНШЫЯ ТАВАРЫ

У сувязі са зменай цэн на хлеб, мясо, яйкі, крупы, макароны і зерно-фураж і загатоўчых цэн на некаторыя віды сельска-гаспадарчай сыравіны (пастанова СНК СССР ад 7-XII 1934 г «Аб адмене картачнай сістэмы на пачаткам хлебу, мукі, крупаў і сістэмы абазначэння тэхнічных культур») Совет Народных Камісараў СССР пастанавіў:

1. Абавязаць усе прадпрыемствы і ўстановы арганізаванай гаспадаркі, ажыццяўляючыя гандлёвую сетку, загатоўчыя арганізацыі, прамысловыя і вытворчыя прадпрыемствы, збытавыя і снабжэнчыя арганізацыі, прадпрыемствы грамадскага харчавання і т. д., а таксама установы, якія знаходзяцца на бюджэце, арабіць на 1 студзеня 1935 года перауўлік і пераацэнку астаткаў (наяўных і ў дарозе): а) хлеба, зерна, мукі, крупаў, макаронаў і зерна-фуражу; б) сельскагаспадарчай сыравіны падлягаемай у цэнах (бавоўны, ільну, пянькі, табаку, кожаных, каракуля, пушнины, рыбы і т. д.), в) поўфабрыкатаў, гатовых вырабаў і прадметаў незавершанай вытворчасці, якія вырабляны з указанай у п.п. «а» і «б» сыравіны і поўфабрыкатаў і знаходзяцца ў прамысловых і вытворчых прадпрыемствах і збытавых базах прамысловасці.

Тавары ў дарозе, адпраўленыя пастаўшчыкамі да 1 студзеня 1935 года, пераацэньваюцца ў залежнасці ад меры іх атрымання.

Уласны насенны матэрыял для патрэб улясных пасеваў (саўгасаў, калгасных гаспадарак, ОРС'аў, ВРК, і да т. п.) пераацэнцы не падлягае.

Хлеб і зернафураж, якія знаходзяцца на загатоўчых пунктах Заготзерна, а таксама зерно, закупленае спецыяльнаперацыяй для адгрузкі Заготзерну, падлягаюць толькі перауўлку, а не пераацэнцы.

3. Астаткі тавараў, указаных ў п. п. «а» і «б» арт. 1, пераацэньваюцца выходячы з новых цэн, уведзеных з 1 студзеня 1935 г. Астаткі поўфабрыкатаў незавершанай вытворчасці і гатовых вырабаў указаных у п. «в» арт. 1 пераацэньваюцца па нормах, устанаўляемых адпаведнымі наркаматамі. Гэтыя нормы павінны быць устаноўлены выходячы з удзельнай вагі сыравіны ў поўфабрыкатах у незавершанай вытворчасці гатовых вырабах і павышэння цэн на сыравіну.

3. Усякасці персональна на народных камісараў Саюза, старшыню Камітэта загатовак пры СНК СССР, старшыню Цэнтрасаюза, старшыні СНК Саюзных і аўтаномных рэспублік і старшынь краёвых (абласных) выканаўчых камітэтаў адказваць за своечасовую і правільную арганізацыю правядзення перауўлку і пераацэнкі на падначаленых ім прадпрыемствах, установах і арганізацыях.

4. Аб рэзультатах перауўлку і пераацэнкі па кожнаму асобнаму гаспадарчаму органу, прадпрыемству, установе, магазіну, загатоўчаму пункту і т. д. павінны быць складзены спецыяльныя акты за подпісам асоб як непасрэдна прымаўшых удзел у правядзенні пераацэнкі, так і кіраўнікоў і галоўных бухгалтараў адпаведных органаў.

У актах павінна быць абазначана ўтаварана колькасць тавару, якая ёсць у наяўнасці, яго старая цана і новая цана і розніца паміж новай і старой цаной.

5. Копіі актаў па перауўлку і правядзенню пераацэнкі ў оптавай і рознічнай гандлёвай сетцы, загатоўчых і збытавых арганізацыях, прамысловасці і ў прадпрыемствах хлебапячэння, спіртавай і спіртагарэлачнай, кандытарскай, макаронтай і піваварнай прамысловасці—прадстаўляюцца фінансавым органам па месту знаходжання прадпрыемстваў.

6. Абавязаць народных камісараў Саюза і Цэнтрасаюза, а таксама СНК саюзных рэспублік, прадставіць не пазней 15 лютага 1935 г. Соўнаркому СССР, з паведамленнем копіі НКФ СССР, справаздачу аб выяўленых па асобных галінах прамысловасці і арганізацыях астатках і аб сумах пераацэнкі.

Вінаватыя за ўтойванні астаткаў, неправільным адлюстраванні на балансе сум пераацэнкі і неправільным выведзенні ў актах сум пераацэнак падлягаюць прыцягненню да крымінальнай адказнасці па закону ад 7 жніўня 1932 г. аб абароне соцыялістычнай уласнасці.

8. Абавязаць адпаведныя наркаматы Саюза і Цэнтрасаюз выдаць па ўзгадненню з НКФ СССР і Дзяржбанкам, падрабязную інструкцыю па выкананню даных пастановы.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ МАСКВЫ І ЛЕНІНГРАДА ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛАН

МАСКВА, 25 снежня. (БЕЛТА). «Правда» друкуе паведамленне маскоўскай гарадской планавай камісіі аб патрэбнасцях выканання прамысловасцю Масквы гадавога плана. 20 снежня ўся прамысловасць Масквы выканала праграму на 100,9 проц.

«Правда» друкуе таксама паведамленне ўладства карэспандэнта аб выкананні 23 снежня Ленінградскай вобласцю гадавога народнагаспадарчага плана прамысловасці. План выкананы на 100,2 проц.

На подлае забойства правадыра ленінградскіх большэвікоў і рабочых С. М. Кірава падонкамі контрэвалюцыйнай зінаўеўскай банды, прыгоўнымі Ленінграда і вобласці адказалі яшчэ большым узмацненнем сваёй радоў вакол партыі, яшчэ большым узмацненнем тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва. Ленінградскія пролетарыі шлёўда ўсвоіці кіраўніцкія словы «план—гэта закон».

Затрыманы яшчэ два шпіёны

ХАБАРАЎСК, 24 снежня. (БЕЛТА). 22 снежня на совецкай тэрыторыі, на захад ад горада Турый Рог, былі затрыманы два японскіх шпіёны, з якіх адзін аказаўся камандзірам аддзялення 15 палка 3-й пяхотнай брыгады Манчжоу-Го Хан Мін-фа, а другі—жыхаром паграніччнага манчжурскага пасёлка Орэнбай. Абодва показалі, што выконвалі загады японскага афіцэра разведкі мясцовасць на ўсход ад горада Пропасці (на захад ад Тур'ега Рога), а імянна: становішча дарог, будаўніцтва казарм і размяшчэнне вайсковых часцей. Па справе праводзіцца тэрміновае расследаванне.

НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІР-ЧЭМ ПІЯНАЦЕ СССР У ЛЕНІНГРАДЗЕ

У 13-м і 14-м турах выйгралі: Багатырчук у Алатарцева, Верасаў у Дубініна, Пятоў у Ілліна-Жэнеўскага, Савіцкі ў Панова, Чэховер у Верасава, Рабіновіч у Мазеля і Ліліцын у Багатырчука. Закончыліся ў нічыю партыі: Юдовіч—Савіцкі, Белавенец—Чэховер, Румін—Раузер і Левенфіш—Белавенец. Адкладзены партыі: Кан—Ліліцын, Рагозін—Рабіновіч, Мазель—Левенфіш, Мальгонаў—Фрэйман, Фрэймах—Ілліч-Жэнеўскі, Раузер—Мальгонаў, Дубінін—Фрэйман, Алатарцаў—Рагозін і Юдовіч—Кан.

Становішча пасля 14-га туру: **Багатырчук** (+9,5 з 14-ці), **Чэховер** (+9), **Белавенец** (+8,5), **Левенфіш** (+8 з 13-ці), **Рабіновіч, Юдовіч** і **Мазель** (па +7 з 13), **Мальгонаў** (+7 з 12) **Румін** (+8 з 13), **Верасаў** (+7 з 14), **Алатарцаў** (+7,5 з 12) і **Кан** (+6 з 11).

26 снежня 1919 г. тав. Ленін падпісаў дэкрэт аб ліквідацыі няграматнасці

15-я гадавіна гістарычнага дэкрэта

Пролетарыят БССР на аснове замацоўвання ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі прыходзіць да 15-гадовага юбілея ленінскага дэкрэта аб ліквідацыі няграматнасці з небывалымі поспехамі на фронце культурнай рэвалюцыі.

БССР пры царыме прадстаўляла адну з найбольш адсталых акраін, дзе няграматнае насельніцтва складала звыш 70 проц.

Пролетарыят БССР пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі з першага-ж моманту ўстанаўлення дыктатуры пролетарыята, пасля таго, як Беларусь была вызвалена ад усіх інтэрвенцыяністскіх банд, энергічна ўзяўся за выкараненне няграматнасці сярод працоўных. Адкрываецца сетка пачатковых школ на беларускай мове і мовах нацыянальнасцей, насельніцтва БССР, стаці адкрываецца педтэхнікумы, ВНУ, ВТНУ і т. п., пачалі выдавацца падручнікі, на ўсіх вёсках разгорнута была работа па ліквідацыі няграматнасці.

Поспехі ў справе рэалізацыі пачатковай асветы сярод няграматнага дарослага насельніцтва і самага першага перыяда існавання дыктатуры пролетарыята ў БССР паказае перапіс 1926 г. Ён устанавіў, што ў БССР няграматнасць усяго працоўнага насельніцтва ад 8 год і вышэй складала 59,3 проц. У абсалютных лічбах 1.836.000, прычым, так званая актыўная частка няграматнага працоўнага насельніцтва ва ўзросце ад 12 да 35 год складала 36 проц. або 666.000 чал. да ўсяго насельніцтва гэтага ўзросту.

Работа па ліквідацыі няграматнасці сярод дарослых у першыя гады значна паралізавалася тым, што колькасць падростаў, якія не ахапілі яшчэ школай, а значыць немінуча ўступалі ў рады няграматных, была значная. За тры гады (1925-1928 год) скончылі ліквідкурсы каля 120.000 чал., а астаўся няграматных падростаў з прычыны таго, што яны не былі ахоплены школай, каля 600 тыс. чалавек. Такім чынам увесь актыў работы па ліквідацыі няграматнасці аказаўся зроблены-ж незначным. У наступныя гады работа па ліквідацыі няграматнасці прыняла шырокі маштаб і дала больш сур'ёзныя рэзультаты. Так, за 6 год з 1923-24 навучальнага года па 1928-29 навучальны год ліквідавана была няграматнасць каля 350.000 чал., а ў наступныя тры гады 1929-32 г. 640.000 чал. Такім чынам БССР дабілася велізарнай перамогі, выхоўваўшыся сярод рэспублік Саюза на першае месца па граматнасці. У тым-жа 1932 годзе ўрад прыняў дэкрэт аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання для малаграматных.

Кантынгенты малаграматных пакуль не ўліквіраны, але яны, бясспрэчна, вельмі малыя. Урад БССР і Наркомасветы прынялі рад мер, каб забяспечыць выкананне рашэнняў XVII партыйнага з'езда аб поўным завяршэнні ў другой пяцігодцы не толькі ліквідацыі няграматнасці сярод насельніцтва Саюза, але і ліквідацыі **«няграматнасці працаздольнага дарослага насельніцтва»**. Для гэтага СНК БССР сваёй пастановай ад 6 верасня гэтага года аб перабудове школ дарослых абавязаў Наркомасветы арганізаваць нармальную сетку вячэрніх школ дарослых з 3 гадовымі перыядам навучання (падрыхтоўчы клас, аснoўны і вышэйшы клясы). Гэта школа павінна даць веды за 4 класы пачатковай школы. Наркомасветы ў гэтым годзе запрактыкаваў арганізаваць 5.300 такіх камплектаў, у якіх будзе ахоплена каля 160.000 малаграматных, і другімі метадамі каля 40.000 чал.

Перамогі на фронце культурнай рэвалюцыі, якія мае Совецкая Беларусь пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, вельмі вялікія. Але гэтыя поспехі не павінны нікому ўскружыць галаву. Работы на фронце ліквбеза—непачаты край. У сувязі з гадавінай ленінскага дэкрэта кожны загалчык раёна, кожнае прадпрыемства, калгас, саўгас павінны паставіць задачу поўнага ахопу вучобай усіх няграмотных і малаграматных поўнага і рэгулярнага наведвання школ дарослых вучнямі, настаўнікамі і культармейцамі, забеспячэння школ памяшканнямі, падручнікамі і сродкамі. Гэта будзе лепшым доказам таго, што мы пабольшэвіцку выконваем заветы Леніна па ліквбезу.

ЛІУШЫЦ.

ДА ТРЫЦЦАЦІГОДЗЯ РЭВОЛЮЦЫІ 1905 ГОДА

Да трыццацігоддзя рэвалюцыі 1905 года ў менскім Музеі Рэвалюцыі адкрываецца новы аддзел «Рэвалюцыі 1905-7 г. г.». У аддзеле будзе выстаўлена да 150 карцін, фатаграфій, пракламацый і т. д. Сярод фатаграфій здымак «Оталія у падполлі ў Тыфлісе ў 1899-1900 гг.». Складаюцца макеты на тэмы «Узбраенае паўстанне на Краснай Прэсне ў Маскве ў 1905 годзе» і «Бутырская турма».

Самалёты агітэскадрыльі імя Горкага ў Слуцку

СЛУЦК, 25 снежня. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»). Сёння ў Слуцк прыбыла звяно самалётаў агітэскадрыльі імя тав. Горкага.

Самалёты «Рабочая Москва» і «Горкаўскі калгаснік» зрабілі пасадку ў калгасе «Камбайн», Парафянскага сельсавета. Калгаснікі калгаса «Камбайн» цёпла сустрэлі лётчыкаў. У сувязі з прылётам звяна ў калгасе праведзен мітынг.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

10 студзеня 1935 г. у 8 гадзін веч. у анатамічным корпусе Беларускага дзяржаўнага медыцынскага інстытута, у аўдыторыі № (10 Університэцкі гарадок) І ДЕУДЗЕЦЦА

1-ае адкрытае пасяджэнне совета медыцынскага інстытута,

на якім будуцца дысертацыі на ступень **доктара медыцыны** дырэктара аспірантуры кафедры, **прафесара М. А. Дзюр Жэцо**, на тэму «ЭКСПЕРЫМЕНТАЛЬНЫЯ КЛІНІЧНЫЯ І СТАТЫСТЫЧНЫЯ ДОСЛЕДЫ па пытанню АБ ТРАУМАТЫЗМЕ І ЗАХВОРВАННЯХ ВАЧЭЙ ПА ПРАМЫСЛОВАСЦІ».

Дырэкцыя медінстытута.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка"	Валікі вяможны фільм У прагрэме гукавы Совэкспа кіно-журнал **XVII Оперыбр у Маскве.**
Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый"	Самая весялая камедыя **Настаўнікі прынц рэспублікі**
Гукавы кіно-тэатр „Інтэрнацыянал"	**Ад 25 снежня Новая праграма**

Кіно „СПАРТАК"

Ад 25 снежня

вечар камедый

3 ПРАГРАМЫ 3 ў АДЗІН СЕАНС

У праграме—кіно хроніка.

ШТОДЗЕНЬНА 4 СЕАНСЫ. КАСА—з 4 гадзін.

ЦП саюза працаспеты разбуйняецца на 4 саюзы

Арганізавана ліквідацыйная камісія па ліквідацыі ЦП.

Усе арганізацыі і асобы, маючыя прэтэнзіі да ЦП саюза, павінны падаць іх у ліквідацыйную камісію на адрасу: Менск, Пляц Волі, Дом прэсы, пакой № 17, **не пазней 31 с. снежня** 1935 г. Пасля пазначанага тэрміну ня іх прэтэнзіі **прыняты ўжо не будуць.**

ЛІКВІДКОМ.

КІРАЎНІЦТВА ДОБРАБЫТУ МЕНГОРСОВЕТА

просіць насельніцтва, загадчыкаў дамаў, дворнікаў пры заўважанні наспраўнасці, або пагарэння

ВУЛІЧНЫХ ЛІХТАРОЎ (ПРАЖЭХТАРАЎ)

паведаміць па тэлефону № 20694 (ПЭС) АДМІНІСТРАЦЫІ.

ПАСТАНОВА № 13

ПРЭЗІДЫУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА АД 16-XII 34 г.

АБ УСЕСАЮЗНЫМ ПЕРАПІСЕ ЖЫВЁЛЫ

На падставе пастановы СНК СССР і СНК БССР «Аб усесаюзным перапісе жывёлы на 1-I-1935 г. прэзідыум Менскага горсовета

ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прапанаваць горінспектуры нарграсучота з 1 па 15 студзеня 1935 года правесці на ўсёй тэрыторыі горада перапіс жывёлы: коней, буйнай рагатай жывёлы, свіней, авец і коз па ўсіх катэгорыях гаспадарак, уключаючы і запасу адчужэння чыгуначнага і шасейнага транспарту з ахопам гаспадарак:

а) на дзяржаўнаму сектару — у саўгасах, ОРС'ах, дзяржаўных, кааператыўных і грамадскіх арганізацыях, гаспадарках прадпрыемстваў, жывёлабазах, пунктах прадубойнага ўтрымання жывёлы і па ўсіх гаспадарках, маючых жывёлу;

б) жывёлу калгаснікаў, аднаасобнікаў, рабочых, служачых і сямітужнікаў.

2. Для правядзення перапісу жывёлы мабілізаваць у якасці старшых рэгістратараў і рэгістратараў у распараджэнне інспектуры нарграсучота 32 чалавек. Спіс мабілізаваных прадставіць на зацвярджэнне прэзідыуму горсовета не пазней 18 снежня 1934 г.

3. Прапанаваць інспектуры нарграсучота правесці інструкцыйную нараду па перапісу жывёлы з рэгістратарамі 26 снежня 1934 г.

4. Прапанаваць усім дырэктарам саўгасаў, ОРС'аў, кіраўнікам дзяржаўных, кааператыўных і іншых устаноў і прадпрыемстваў камандзіраваць сваіх прадстаўнікоў у інспекторам нарграсучота (горсовет) не пазней 29 снежня 1934 г. для атрымання адпаведных бланкаў па перапісу жывёлы і інструктажу аб тэрмінах і парадку іх запаўнення.

Адначасова папярэдзіць усіх кіраўнікоў, што за своечасовае і добраякаснае правядзенне перапісу жывёлы яны нясуць персональную адказнасць.

5. Прапанаваць калгасам, домакіраўніцтвам, домаўласнікам аказаць усямерную дапамогу рэгістратарам па перапісу жывёлы і дакладнаму выяўленню колькасці жывёлы ва ўсіх гаспадарках. Папярэдзіць іх, што за сведамасць утойванню жывёлы яны будуць прыцягвацца да судовай адказнасці.

6. Прапанаваць інспектуры нарграсучота ўсе справы па ўтойванню жывёлы неадкладна перадаваць пракурору для прыцягнення іх да судовай адказнасці.

Абавязаць пракурора разглядаць гэтыя справы не больш як праз тры дні.

З мэтай выяўлення ўтойвання жывёлы на гораду правесці кантрольны абход двароў з ахопам не менш 10 проц. домаўладанняў. Правядзенне гэтай работы ўскласці на ўпаўнаважаных горсовета. Спіс упаўнаважаных прадставіць на зацвярджэнне прэзідыуму.

7. Прапанаваць горінспектару нарграсучота аб выніках учота жывёлы па гораду дакладваць прэзідыуму горсовета 25 студзеня 1935 г.

Старшыня горсовета ЖУКОВІЧ.
Сакратар горсовета ІПАТАЎ.

ПРАДАЎЖАЕЦЦА ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1935 ГОД

на газету

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—2 р. 50 к. на 3 м.—7 р. 50 к. на 6 м.—15 р. на 1 г.—30 р.

Падпіска прымаецца: горбюро Саюздрука, атэнцтвамі сувязі і газетаносцамі.

АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ГАНДЛЮ ХЛЕБАМ

з пастановы прэзідыума праўлення Белкаапсаюза *22 снежня 1934 года*

Тав. БАРЗУНОВУ і дырэктарам хлебазаводаў на першыя дні студзеня забяспечыць пры хлебазаводах павялічаны рэзерв печанага хлеба, выходячы з плана рэалізацыі. ПАПЯРЭДЗІЦЬ дырэктароў хлебазаводаў, што за дапушчэнне малейшых перабояў у выпечцы хлеба і выпуску недобраякаснага хлеба яны будуць прыцягнуты да судовай адказнасці як за зрыў важнейшага мерапрыемства партыі і ўрада.

Тав. ПІТЛЯКОВУ даць тэлеграфнае ўказанне старшыням РСС аб рэзерве печанага хлеба, які павінен быць створан пры кожнай пекарні ў першыя дні студзеня, выходячы з плана рэалізацыі.

Старшыням РСС у першыя дні выпечкі хлеба арганізаваць спецыяльнае кіраўніцтва непасрэдна ў пекарні з тым, каб забяспечыць поўную добраякасную выпечку хлеба, папярэджваючы, што за дапушчэнне выпуску недобраякаснага хлеба і малейшага перабою ў выпечцы і малейшага зрыву будуць прыцягнуты да судовай адказнасці як за зрыў важнейшага мерапрыемства партыі і ўрада.

Для прадстаўлення магчымасці завозіць хлеб у крамы 31.XI на першыя дні студзеня і недапушчэння перагрэвання абслугоўвання насельніцтва ў выдачы ім хлеба на картках у апошнія дні снежня (29-30-31) АБАВЯЗАЦЬ асабіста старшынь горспажыўсаюза, ЦРК, ЗРК і РСС забяспечыць нармальны продаж хлеба па картках да 1.I.35 г.

АБАВЯЗАЦЬ старшынь горспажыўсаюза, ЦРК, ЗРК і РСС у першыя дні студзеня забяспечыць за ўсіх хлебных крамах, палатках і аддзяленнях павялічаны рэзерв печанага хлеба і бесперабойную дастаўку ў крамы прадукцыі хлебапячэння.

Для бесперабойнага продажу насельніцтву хлебных вырабаў абавязаць старшынь кааператыўных падоўжыць часы продажу хлебных у крамах, палатках, ларках, аддзяленнях і адмяніць у першыя дні студзеня выходныя дні прадаўцам і касірам, узгадніўшы гэта пытанне з профарганізацыямі, забяспечыць наяўнасць дробных грошай у касах для здачы.

Горспажыўсаюзу, ЦРК, ЗРК і РСС скласці планы расстаноўкі прадаўцоў хлебных крам, мабілізаваўшы на першыя дні студзеня лепшых прадаўцоў іншых крам.

30-га снежня правесці інструкцыйную нараду ўсіх работнікаў хлебных аддзелаў.

ПАЧЫНАЮЧЫ З 26 ПА 1-I. 35 г., сістэматычна змяшчаць у друку аб адрасах, гадзінах работы ўсіх хлебных крам, палатак, ларкоў і аддзяленняў і асобна апавяшчаць насельніцтва пра адкрытыя і аб'явы аб дадатковых адкрываемых хлебных аддзелах і булачна-кандзітарскіх з указаннем іх адрасоў.

ПРАПАНАВАЦЬ старшыням горспажыўсаюза, ЦРК, ЗРК і РСС устанавіць дыспетчарскі графік транспартавання хлебазаводаў і пекарэнь да крам, палатак, ларкоў і аддзяленняў, прымацаваўшы пастаянны транспарт да адпаведных хлебных аддзелаў, і скончыць да 26 снежня г. прымацаванне хлебных аддзелаў да хлебазаводаў і пекарэнь, забяспечыўшы бесперабойную дастаўку хлеба і падрыхтоўку фуражоў і інвентару (вазы, гіры, розныя сеі, лапы, спецвопраткі і т. д.), забяспечыць наяўнасць рэзервовага транспарту.

Для забеспячэння ў гарадах разгорнутай работы на лініі гандлю хлебам, правільнай арганізацыі работы ў кожнай хлебнай гандлёвай аддзінцы (расстаноўка прадаўцоў, забеспячэнне вагамі, гірамі, лапамі, прэйскурантамі), арганізацыі культурнага абслугоўвання спажыўца прымацаваць да гарадоў БССР і аснoўных раёнаў ніжэйпералічаных работнікаў, якія павінны на месцах арганізаваць своечасовую падрыхтоўку і работу па гандлю хлебам, прымацаваўшы работнікаў ЦРК, ЗРК, РСС да асобных крам, хлебазаводаў і пекарэнь:

Да Віцебскага ЦРК — тав. БАСКІНА
» Менскага горспажыўсаюза — тав. КАСТРУЛЕВА.
» Мар'інаўскага ЦРК тав. ДАХОЎКЕРА.
» Бабруйскага ЦРК тав. КАНТОРА.
» Аршанскага ЦРК тав. ГЛІКМАНА.
» Полацкага ЦРК тав. МАТУСЕВІЧА.
» Мазырскага ЦРК тав. ЛЮБІЧА.
» Гомельскага ЦРК тав. ЛЯХАВА
» Рэчыцкага ЦРК тав. ЛАСТОЎСКАГА.
» Барысаўскага ЦРК тав. ЗЯМАНАСА.

ВЫЕЗД РАБОТНІКАЎ У ГАРАДЫ УСТАНАВІЦЬ да XII. ТЭРМІНАМ ДА 8-I 1935 г.

Абавязаць тт. БАРЗУНОВА, КАСТРУЛЕВА і ПІТЛЯКОВА устанавіць, пачынаючы з 29-XII гг., дзяжурства адказных работнікаў пры поўных тэлефонах, паведамляючы аб гэтым усім кааператыўным арганізацыям.

Старшыня прэзідыума праўлення БКС ЬЯЖКІН.

Рэдкал., друкарня «Звязды». Выпускаючы — БУТОМАЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІН ст. метранпаж — ПЕРАЛЫГІНЕЎ, ст. стэрэатыпёр—ПЕДЗІН, ст. друкар АНУЧЫН. Тыраж 35.000 Уп. Галоўлітбела № К—6340.